Калядкі ў Гайнаўцы ☞ 3

Ніва

ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ

PL ISSN 0546-1960

NR INDEKSU 366714

Беларускія палітыкі ☞ 8

http://niva.iig.pl

redakcja@niva.iig.pl

№ 04 (2802) Год LV | Беласток, 24 студзеня 2010 г. | Цана 2,50 зл. (VAT 0%)

Вечная памяць Янку Крупу!

12 студзеня 2010 года, на 73-м годзе жыцця, адышоў у вечнасць Янка Крупа. Ягонае жыццё выпала на пераломны нашаму грамадству гістарычны перыяд. У паўналецце Янка Крупа ўвайшоў у 1956 годзе, які ў нашай геапалітычнай частцы свету стаў годам гэтак названай адлігі. А для беларусаў Беласточчыны быў гэта год, калі яны ўпершыню маглі афіцыйна загаварыць на сваёй мове. І была гэта такая нечаканасць, ад якой шмат каму язык засох у горле; не на іх наша ўвага...

Пасляваенныя гады прынеслі таксама ўздым небывалай дагэтуль міграцыйнай хвалі, новыя магчымасці. Наша моладзь таго часу стаяла адной нагой яшчэ на беларускамоўнай вёсцы, але другой нагой ужо ў польскамоўным горадзе. І быў гэта час, калі абсела навеяная вайной хваля зла, калі наша маладое пакаленне магло ставіць перад сабой нескладаныя тады жыццёвыя мэты і рэалізаваць іх. Свет адкрыўся перад мясцовым адвечна мужыцкім насельніцтвам і яго душы напоўніліся такой радасцю, якая не старэе.

У такім грамадскім клімаце рос і сталеў Янка Крупа і ў такое ж рэчышча ўклаўся Ягоны жыццёвы лёс. Вучыцца Ён у родных Рудутах, у Орлі, у Бельску-Падляшскім. Прыцягвае Яго і набрынелы беларускамоўнай моладдзю Беласток, у якім адкрываюцца далейшыя магчымасці ставіць жыццёвыя задачы і здзяйсняць іх. У Беластоку ўзнікае беларускі эстрадны калектыў „Лявоніха", у якім Янка Крупа становіцца адной з найярчэйшых яго зорак. У калектыве змяняліся танцоркі, вакалісты, акампаніятары, не змянялася толькі характэрная жыццерадасная ўсмешка Янкі Крупы.

Усё ж такі змена наступіла, „Лявоніха" спыніла сваю дзейнасць. Янка Крупа марыць пра чарговыя мастацкія высоты, працягвае мастацкую адукацыю, выязджае з напоўненага родным Беластока за новымі выклікамі. Але ў чужым асяроддзі, у Шчэціне, Ягоная душа адчувае сябе няёмка, быццам у нейкай клетцы, і Ён, вытрымаўшы там толькі адзін год, вырываецца адтуль да сваіх. У Беластоку зноў акунаецца ў вір беларускай мастацкай дзейнасці, цяпер ужо перадаючы свае веды і вопыт чарговым майстрам роднага слова. Нялёгкая праца, ахвярная, паволі падрывае Ягонае здароўе. І сум, што той свет, у якім Ён вырас, згортваецца, мяняецца ў іншым напрамку.

Янка Крупа быў жыццерадасным чалавекам і гэтай радасцю стараўся дзяліцца з іншымі. Астанецца ў шырокай памяці цёплым, добразычлівым чалавекам. І ў грамадскім сваім стаўленні намагаўся ён выконваць інтэграцыйную ролю, адносіцца да ўсяго з дабрынёю.

Янка Крупа да канца сваіх дзён даражыў родным. Апрануў Ён у вечны спачынак тую вопратку, у якой найбольш радавалася Ягоная душа, у якой Ён выступаў на нашых вясковых сцэнах. І спачыў Ён у роднай зямельцы, на тых могілках, дзе ляжаць Ягоныя продкі, аднавяскоўцы з Рудутаў. Аддаў Ён прах свой той зямельцы, з якой Ён вырас, дзе фармавалася Ягоная высакародная беларуская душа. Хай яна будзе Яму цёплай пярынкай.

Словы спачування родным і блізкім Янкі Крупы выказвае

Рэдакцыя

Пра Янку Крупу і ягонае жыццё можна больш прачытаць у 5 і 6 н-рах „Нівы" за 2007 г.

Паважаныя сябры!

Калі вы зацікаўлены гісторыяй і культурай Беларусі і беларусаў, іх сучасным жыццём, калі вы актыўныя і творчыя асобы, то запрашаем вас да ўдзелу ў II конкурсе *„Пазнай Беларусь"*, які арганізоўвае Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча

Конкурс праводзіцца пад ганаровым патранатам Надзвычайнага і Паўнамоцнага Пасла Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча В. А. Гайсёнка

Умовы конкурсу

У конкурсе могуць прымаць удзел дзеці і моладзь, творчыя калектывы, гурткі асветных і культурных устаноў Польшчы ва ўзросце ад 3 да 18 гадоў. Да ўдзелу ў конкурсе прымаюцца працы на беларускай і польскай мовах (вітаюцца арыгінальнасць і творчы падыход да афармлення).

Запрашаем да ўдзелу па наступных намінацыях:

— лепшы малюнак, пластычная праца пра Беларусь (фармат А4 і А3);

— фотаздымак аб Беларусі ці беларусах (памер здымка ад 18/24 см і вышэй);

— літаратурна-паэтычны твор (апавяданні, вершы, замалёўкі і г.д.);

— сачыненне „Беларусь у гісторыі маёй сям'і".

Па кожнай намінацыі вызначаюцца пераможцы па чатырох узроставых катэгорыях: ад 3 да 6 гадоў, ад 7 да 12 гадоў, ад 13 да 15 гадоў, ад 16 да 18 гадоў.

Конкурс праводзіцца *з 15 студзеня 2010 г. па 29 сакавіка 2010 г.* Аб выніках конкурсу і месцы правядзення ўрачыстага падвядзення вынікаў удзельнікі і іх настаўнікі будуць папярэджаны загадзя.

Конкурсныя работы можна дасылаць да 30 сакавіка 2010 г. на адрас:

Культурны цэнтр Беларусі пры Пасольстве Рэспублікі Беларусь у Рэспубліцы Польшча **вул. Модліньска 2 15-066 Беласток, e-mail: poland.kcb@belembassy.org**

9 770546 196000

Машыны і мужчыны

Што першае прывёз беларус з-за мяжы, калі толькі-толькі прыадчынілі жалезную заслону? Канечне, машыну. Старэнькую, танную, бітую, падзёртую, ужо непатрэбную ні немцу, ні французу, ні нават эмігранту з Турцыі. І хоць гэты самаходзік шмат і доўга паездзіў па дарогах Еўропы, а ўсё ж быў нашмат лепшы і таннейшы, чым расійскія „жыгулі" ды „волгі". Можа таму яго, незалежна ад выгляду, стану і года выпуску, з павагай называлі „іншамарка", што ў простым тлумачэнні азначала „іншаземная марка".

Іншамаркі імгненна выцеснілі расійскія аўтамабілі з беларускай зямлі. У дадатак, у цяжкія гады, яны далі працу многім беларусам. І не толькі працу, але і мажлівасць свет паглядзець ды сябе паказаць. Толькі гультай у дзевяностыя гады мінулага стагоддзя не з'ездзіў па машыну ў Еўропу. Купляць яе беларусу на сваёй зямлі лічылася недапушчальным і абразлівым. А ўзяць грошы ды, не баючыся ні свайго рэкету, ні замежных бандытаў, ні польскіх паліцыянтаў, прыгнаць з-за мяжы для сваёй любімай сям'і танны, але надзейны, самаходзік успрымалася як справа мужчынскага гонару. Нарэшце галава сям'і мог адчуць сябе вартым і важным. Мог сябе адчуць мужчынам.

Для небагатага беларуса шанц набыць машыну быў амаль што адзіны. А сама машына была больш патрэбная, чым усё астатняе. Бо гэта мажлівасць і бацькоў адведаць, і на вёску з'ездзіць бульбачку дапамагчы старым пасадзіць і выкапаць, і на лецішча махануць, і дзяцей на шашлыкі ў лес вывезці, і на рыбалку з сябрамі скочыць, ды нават жонку на курорт на Украіну звазіць. Шмат шчаслівых хвілін падарылі беларусам тыя іншамаркі!

А колькі іх прадавалася ў Расію! Беларускія людзі багацець з таго сталі, свой бізнес заводзіць і падаткі дзяржаве плаціць пачалі, магазіны запчастак і сервісы па рамонце адчыняць узяліся. Тут беларусы паказалі сябе вельмі працавітымі, кемлівымі ды даволі прадпрымальнымі. Тут бы ўладзе ўчапіцца за тыя якасці ды мажлівасці, угледзець у іх падарунак лёсу ды развіваць і падтрымліваць тое, што само па сабе, з мазаля іх грамадзян рабілася. Ды дзе там! Не туды тое. Улада стала думаць як гэтых людзей абдзерці ды паздзекавацца з іх гонару памацней. А то сталі беларусы жыць больш вольна, чым пры расійскім прыгонным праве, і багацей, чым пры Савецкім Саюзе. Не падабалася гэта ні іхным „расійцам", ні сваім „саветам".

Прыдумалі мытныя пошліны на надзейныя „іншамаркі" большыя, чым тыя каштуюць. Расійскія, небяспечныя на дарогах „вазы" (націск у гэтым слове можна ставіць і на першы, і на апошні склад), кшталту „газель" ды „жыгулі", мытнай пошлінай не аблажылі. Расійскі рынак абаранілі. За кошт беларусаў, як заўсёды. Падцягнулі беларусы папругі на брухах ды сталі і да гэтых правілаў неяк прыстасоўвацца. Ды толькі прыцёрліся да сітуацыі так-сяк, як новы ўдар. Беларусь, аказваецца, ужо даўно ў нейкай саюзнай дзяржаве. А цяпер, тая саюзная дзяржава, вырашыла адзіныя мытныя пошліны зрабіць і ў Расіі, і ў Беларусі. І не сярэднія якіясьці, а менавіта расійскія. Гэта значыць, кошты на „іншамаркі" ў Беларусі ўзрастуць.

Як трэба не любіць свайго народа, каб ударыць так нахабна, у спіну і з-за вугла, па яго апошняй радасці і апошняй мажлівасці з'ездзіць да бацькоў, завезці ў школу дзетак, адчуваць сябе руплівым сем'янінам, і проста працавітым сумленным чалавекам. Хіба ва ўладных кабінетах не ведаюць, што для многіх беларусаў цяпер набыць машыну стане недасягальнай марай. Ведаюць. Але хіба не хочуць звяртаць увагі. Бо куды, хіба што, важней патрапіць у расійскі клан, які на тых пошлінах добра рукі грэе, пра што даўно крычаць сумленныя расійскія журналісты і проста чэсныя людзі.

Ну што ж! Відаць, некаму беларус на машыне псуе яго погляд на свет. Відаць, нехта думае, што беларус мусіць быць толькі ў лапцях. Тады, на гэтым фоне, вопратка звычайнага, такога ж няшчаснага расіяніна не асабліва будзе адрозніваць. Хоць рускіх людзей усё часцей апранаюць у вайсковыя мундзіры ды з машын перасаджваюць на танкі. Хіба, хутка, і да беларусаў справа дойдзе. Прынамсі, з машын ужо высаджваюць.

Віктар САЗОНАЎ

Нязгода руйнуе!

У першым нумары „Нівы" за 2010 год прачытаў я справаздачу з XVI З'езда Беларускага грамадска-культурнага таварыства пад іранічным загалоўкам „З'езд-опера" і мне сумна-сумна стала. Да чаго мы, бедныя, дакаціліся?! На жаль, і раней між намі ўсялякае бывала. І часценька ўзнікалі розныя спрэчкі і канфлікты, але каб аж так? Дасканала прытым ведаючы да чаго даводзіць нязгода. Мы ж ужо і так нямала страцілі праз яе, праклятую. Бяда яшчэ і ў тым, што прырода нашай нязгоды не нейкая часовая, лакальная спрэчка пакаленняў — што ва ўсіх народаў бывае. А нацыянальная, хранічаня, татальная. Ды і з такой магчымым быў бы яшчэ даволі ганаровы выхад, каб мы свае ўзаемныя прэтэнзіі ўмелі і хацелі рашаць толькі між сабой і ціха. А не на ўсё горла і на ўсю губерню. Менавіта ў гэтым найгоршая бяда і ганьба.

Хто вінаваты? — Вінаватыя ўсе мы — проста не ўмеем і не хочам дагаварыцца ціха, спакойна між сабой, пайсці на ўзаемныя ўступкі.

Мяне і многіх членаў беларускага таварыства Гайнаўкі пакрыўдзіла напрыклад тое, што перадз'ездаўскі сход нашых членаў адбыўся ў „Гурніку". Мы ж маем свой вялікі, прыгожы будынак Беларускага музея з панадворкам у цэнтры горада. Там адбываюцца розныя беларускія і небеларускія імпрэзы. Там часценька праводзяць сходы і сустрэчы розныя свецкія і рэлігійныя арганізацыі. А вось наша беларуская арганізацыя, многія члены якой уклалі так многа сваёй працы ў пабудову гэтага музея, аблюбавалі месца сустрэчы ў чужым будынку. У чым жа справа? Ці дырэкцыя музея не згадзілася на такі сход, ці кіраўніцтва таварыства не пажадала праводзіць у музеі сход, бо не любіць музейнай дырэкцыі? Ці яшчэ штосьці. Усё гэта вельмі заганнае і да дабра не давядзе, бо ні сэнсу, ні логікі тут няма...

Прыглянься цяпер нашым тутэйшым беларускім арганізацыям і рэдакцыям, якія займаюцца беларускімі ці праваслаўнымі справамі. Ці ў сваёй дзейнасці кіруюцца яны адной, супольна выпрацаванай і неабходнай тут нам нацыянальна-меншаснай палітыкай, узаемнай дапамогай і пашанай? — Не вельмі. А павінны — калі хочам штосьці значыць тут. А вось узаемнай непрыязнасці, варажнечы і заядлай крытыкі — „і оўшам". Каму гэта патрэбна і каму гэта служыць? Бо нам, беларусам, і нашай справе напэўна не служыць. Камусьці, аднак, служыць... Варта прыгадаць тут яшчэ адну народную мудрасць. Помніце, як бацька склікаў сваіх сыноў і даў ім спачатку паасобныя галінкі ад веніка, а потым цэлы венік. І калі паасобныя галінкі лёгка імі ламаліся, то цэлы венік — дудкі, ён і сёння цэлы.

Прыпомніце яшчэ адну больш блізкую нам мудрасць. Не так даўно было ў нас дзве, здавалася б, непрымірымыя сілы: партыя і салідарнасць. Адны хацелі ўтрымацца пры ўладзе, а другія агрэсіўна пёрлі да яе. І ўсё ж такі ўзяў верх розум — яны сумелі сарганізаваць круглы стол і нейк дагаварыцца. Чаму б і нам не сарганізаваць нейкі мініст-стол і папрабаваць выпрацаваць нейкі кампраміс. Нас мала, наша сітуацыя даволі ясная і не маем чаго тут дзяліць, а згода між намі проста неабходная, бо толькі яна будуе...

У згаданай справаздачы выказвае сваю заклапочанасць узаемаадносінамі паміж беларусамі Беласточчыны і заахвочвае нас да размоў і генконсул Рэспублікі Беларусь у Беластоку, бо нагадваем тым яму растапыраныя пальцы. І, канешне, мае генконсул рацыю ў справе растапыраных пальцаў. Але, мне здаецца, што было б яшчэ лепей, каб генконсул пашырыў гэтую тэму і прывёў прыклады, дзе беларусы не нагадваюць растапыраных пальцаў, а жывуць у згодзе, дружбе і тым самым проста працвітае ў іх беларушчына...

Рэдакцыі і чытачам „Нівы" ўсяго найлепшага ў Новым годзе!

Васіль САКОЎСКІ

Вачыма еўрапейца

Знакаміты вынік?

Разам з пераломам года паказаліся вынікі двух даследаванняў грамадскай думкі наконт задавальнення ад жыцця ў Беластоку. Правялі іх TNS OBOP і фірма PBS DGA. Згодна з імі — мабыць, таксама і спадзяваннямі муніцыпальных улад — беластачане рады жыццю ў сваім горадзе. З доследаў OBOP вынікае, што м.інш. аж 59% гараджан задаволены працай Гарадской управы, а толькі 8 на 100 чалавек заявілі, што працуе яна кепска або вельмі кепска. Падобна большасць вырашыла, што чыноўнікі кампетэнтныя і культурныя, ангажуюцца ў выконванне сваіх абавязкаў, выконваюць іх тэрмінова, адкрытыя яны і ветлівыя. Паводле OBOP 83% беластачан прыкмеціла, што выразна паправіўся выгляд вуліц. Жыхары падляшскай сталіцы выказваюць задавальненне ад культурнай і забаўляльнай прапаноў. 60% гараджан мяркуе, што лепш выглядае гарадская зелень, а 80% прыкмеціла паляпшэнне ў выкарыстанні еўрасаюзных фондаў, прычым была звернута ўвага на тое, што цяпер гарадскія ўлады не прымаюць пад увагу пры планаванні інвестыцый думкі жыхароў (ды што там!). Гэтых „радасцей" больш. У найгоршым выпадку — з пункту погляду ўлад — пагоршылася няшмат, можа толькі тое-сёе „засталося без змен" (напрыклад, сітуацыя ў асвеце, бяспека, камунальныя паслугі, ацяпленне, забеспячэнне газам). У сваю чаргу, згодна з вынікамі PBS DGA, аж 90% апытаных палічыла, што Беласток з'яўляецца добрым і вельмі добрым месцам для жыцця.

— Знакаміты вынік! — выгукнуў у размове з „Выбарчай газетай" прэзідэнт Беластока Тадэвуш Трускаляскі.

У выніках PBS DGA можна таксама прыкмеціць радасць беластачан ад паправы дарожнай інфраструктуры, эстэтыкі і чысціні ў горадзе, а далей таксама ад культурных прапаноў.

— Галоўныя прыярытэты хораша ўспрыняты, — ганарыцца прэзідэнт Трускаляскі.

Апытаныя гэтым цэнтрам вывучэння грамадскай думкі найгорш ацанілі рынак працы. Прэзідэнт Беластока:

— Звязана гэта з агульнай запаволенасцю эканамічнага развіцця.

Зараз пасля спрабаваў ён паддаць аптымізму:

— Перайшлі мы гэта, аднак, сухой нагой, або адчулі толькі крыху.

Адкуль таму — спытаўся я ў самога сябе — тое незадавальненне?

Прэзідэнту адказ вядомы:

— З пункту погляду працаўніка рынак працы мог папсавацца. З пункту гледжання працадаўцы, не пагоршыўся. Фірмы, якія рэалізавалі гарадскія інвестыцыі, напрыклад, Рынак Касцюшкі, не мелі праблем з падабраннем дадатковых работнікаў. Некалькі гадоў таму магла б быць з гэтым праблема. Звязана гэта з выездамі на адкрытыя замежныя рынкі працы.

Я падумаў: ёсць блага, але добра. Калі пачытаў аб тым, што думаюць аб жыцці ў сваім горадзе беластачане, пайшоў з работы дахаты. Прадзіраўся я праз гурбы снегу ў цэнтры, загразаў у снезе, што і раз падымаючы галаву і прыкмячаючы брыдкія рэкламы крамаў, півярняў і гэтак далей (гэта таксама „эстэтыка горада"!). На прыпынку глянуў на таблічку, калі прыедзе „мой" аўтобус. Зноўку ў гэтую асабліва снежную зіму, так як і летам, калі рамантаваўся шэраг вуліц, прыехаў ён са спазненнем. У гэты раз аўтобус спазніўся каля 10 хвілін. Затое прыехалі адзін за адным тры з такім самым нумарам. Я задумаўся: ці аж так цяжка каардынаваць працу гарадскіх транспартных суполак, значыць, язду аўтобусаў, калісьці такую пунктуальную? А зараз пасля: можа не ёсць аж так хораша, як заяўляюць апытаныя цэнтрамі даследавання грамадскай думкі беластачане.

Мацей ХАЛАДОЎСКІ

Мнагалюднае калядаванне

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Калектыў „Жывіца" з Беларусі падрыхтаваў калядныя сцэнкі на беларускай літаратурнай мове, а таксама аўтэнтычныя калядкі

Жыхары Гайнаўкі здаўна мелі нагоду слухаць каляднікаў, якія наведвалі іх хаты і кватэры ў блоках. Знаёміліся яны таксама з калядным рэпертуарам са сцэны Гайнаўскага дома культуры. Яшчэ пры народнай уладзе сталі ў Гайнаўцы ладзіцца раённыя агляды калядных калектываў, а пасля ў прыпушчанскі горад завіталі ваяводскія калядныя агляды. Аднак на калядаванне са сцэны не траплялі малодшыя выканаўцы, якія калядавалі па горадзе. Да калядных выступленняў на сцэне дзетак і моладзь заахвоцілі, між іншым, Яўген Сачко і Міхал Голуб, якія з 1998 года сталі ладзіць у Гайнаўскім белліцэі святочныя сустрэчы з праваслаўнымі калядкамі. Праз некалькі гадоў лепшыя выканаўцы гэтых сустрэч сталі калядаваць на сцэне дома культуры, а з 2003 года ўсё мерапрыемства перабралася туды, а галоўнымі яе арганізатарамі сталі Дэканальны інстытут праваслаўнай культуры ў Гайнаўцы, Гайнаўскі дом культуры і Саюз „Любіцелі царкоўнай музыкі". На калядаванне ўжо і раней запрашаліся калектывы з Рэспублікі Беларусь і Украіны і таму пераўтварылася яно ў Міжнародны фестываль „Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай". У гэтым годзе ў сустрэчах з праваслаўнай калядкай, што праходзілі з 14 па 16 студзеня ў ГДК, прынялі ўдзел каляднікі з Беларусі. Прыбылі яны ў Гайнаўку з багатым калядным рэпертуарам. Цікавы рэпертуар прэзентавалі таксама гайнаўскія каляднікі і госці з Гайнаўскага і Бельскага паветаў. Пра маштаб гайнаўскага мерапрыемства сведчылі 40 калядуючых груп, у якіх выступілі каля 800 дзетак і моладзі. Усе яны атрымалі святочныя падарункі, а пераможцы 16 студзеня вярнуліся з гала-канцэрта з узнагародамі. У нядзелю, 17 студзеня, у Гайнаўскім доме культуры адбыўся Экуменічны канцэрт калядак, у якім запрэзентаваліся пераможцы Гайнаўскіх сустрэч з праваслаўнай калядкай і іншыя гайнаўскія калектывы, у тым ліку і каталіцкія.

Калядаванне ўжо традыцыйна распачалося з выступаў дашкольнікаў, а пасля на сцэну выходзілі вучні падставовых школ. Наймалодшыя каляднікі былі апрануты ў святочную вопратку, а выступам спадарожнічалі звёздачкі, якія на сцэну выносілі іх апекуны або бацькі. Дзеткі спявалі калядкі шчыра, стараючыся паказацца як найлепш перад публікай і сямейнікамі. Калі нават спяванне ў дашкольнікаў атрымлівалася крыху няроўна і так захаплялі сваімі жэстамі, адважнымі паводзінамі на сцэне, ці просьбамі на калядаванне, што займальна гучалі ў вуснах наймалодшых. Конкурсная камісія, якую састаўлялі айцец Мікола Беламызы, Міраслава Мацюка і Марта Грэдаль, першае месца прысвоіла групе калядоўшчыкаў „Звёздачкі" з Прадшколля № 5 у Гайнаўцы, другое месца заняла група калядоўшчыкаў з Прадшколля № 9 у Бельску-Падляшскім, а на трэцім месцы апынуліся „Званочкі" з Прадшколля № 3 у Гайнаўцы і „Жамчужынкі" з Прадшколля № 2 у Гайнаўцы.

Вучні падставовых школ прэзентавалі прыстойны ўзровень спеву, але і ад іх конкурсная камісія больш патрабавала. Старэйшыя вучні вучацца ж спяваць на адмысловых занятках музыкі, а калядаваць вучыліся таксама на занятках Божага закону. Першае месца сярод вучняў падставовых школ заняў калектыў „Ранок" з Падставовай школы № 4 у Бельску-Падляшскім, другое месца камісія назначыла калектыву „Вянок" з бельскай „тройкі", а трэцяе месца атрымаў хор Комплексу школ з інтэграцыйнымі аддзяленнямі з Гайнаўкі. Цешыць, што частка выканаўцаў рашылася спяваць калядкі ў арыгінале, так як спяваліся яны на Гайнаўшчыне ці Бельшчыне. Арганізатары мерапрыемства прыдбалі для ўсіх выканаўцаў падарункі з ласункамі.

— Арганізуючы Міжнародны фестываль „Гайнаўскія сустрэчы з праваслаўнай калядкай", прапагандуем сваю традыцыю і інтэгруем наша праваслаўнае асяроддзе, — заявіў протаіерэй Павел Стэрлінгаў са Свята-Троіцкага прыхода ў Гайнаўцы, кіраўнік Дэканальнага інстытута праваслаўнай культуры. — У гэтым годзе не атрымалі мы ніякага вонкавага дафінансавання на мерапрыемства і ладзім яго за сродкі ад спонсараў і вернікаў. На дзейнасць Інстытута праваслаўнай культуры мы збіралі сродкі ў час святаў Нараджэння Хрыстовага ў Гайнаўскім і Кляшчэлеўскім дэканатах, а Сустрэчы з праваслаўнай калядкай з'яўляюцца адным з самых вялікіх нашых мерапрыемстваў.

Яшчэ большую ўвагу на тэхніку спеву і інтэрпрэтацыю выканання калядак звярталі гімназісты і вучні сярэдніх школ, якія выступілі ў адной катэгорыі. Вельмі высокі ўзровень спеву запрэзентавалі вучні сярэдніх школ, якія падбіралі больш складаны рэпертуар, стараючыся ўзорна выканаць традыцыйныя калядкі. Спецыяльную ўзнагароду ў гэтай катэгорыі атрымаў калектыў „Жывіца" з Параслянскай сярэдняй школы Пружанскага раёна. Замежныя каляднікі прыехалі ў народнай вопратцы, паколькі „Жывіца" з'яўляецца фальклорным калектывам. На гайнаўскае мерапрыемства вучні з Беларусі падрыхтавалі калядкі і калядныя сцэнкі на беларускай літаратурнай мове і аўтэнтычныя калядкі з Пружаншчыны.

— Мы сёлета, як і ў мінулых гадах, калядавалі ходзячы ад хаты да хаты па сваёй мясцовасці са спецыяльнай праграмай, дзе побач калядак прэзентавалі сцэнкі з казой і мядзведзем, — паінфармавала кіраўнік калектыву „Жывіца" Людміла Ляшчынская. На гайнаўскіх сустрэчах выступілі яны таксама са звяздой, мядзведзем і казой. Калядавалі, танцавалі і выступалі са святочнымі дыялогамі, захапляючы публіку новым, як на гайнаўскае мерапрыемства, рэпертуарам. Прысутнаму ў час калядавання архіепіскапу Мірану беларускія каляднікі ўручылі святочны падарунак, а ўладыка Міран падорыў гасцям з Беларусі сувенір, а ўсім каляднікам раздаў іконкі.

— Межы раздзяляюць людзей, але не іх душы, — заявіў архіепіскап Міран і са святочнымі пажаданнямі звярнуўся на беларускай літаратурнай мове да вучняў з Беларусі і іх апекуноў. Прыгожы выступ калектыву „Жывіца" належным чынам ацаніла таксама конкурсная камісія, адзначыўшы іх спецыяльнай узнагародай. Першую ўзнагароду ў катэгорыі вучняў гімназій і сярэдніх школ атрымаў калектыў „Знічка" з Гайнаўскага белліцэя, які перфектыўна выступіў з вельмі прыгожым калядаваннем. Другое месца ў гэтай катэгорыі атрымаў калектыў „Tutti Cantare" з I Агульнаадукацыйнага ліцэя з Гайнаўкі, а трэцяе месца заняла група калядоўшчыкаў з Бельскага белліцэя.

Вучні з Гайнаўшчыны і Бельшчыны спявалі не толькі ў школьных калектывах, але ўдала прэзентаваліся таксама ў прыхадскіх харах і іншых вакальных групах. У катэгорыі „іншыя маладзёжныя групы калядоўшчыкаў" першае месца камісія прысудзіла вакальнаму калектыву Студыі эстраднай песні з Гайнаўскага дома культуры і калектыву „Гілачка" з Чаромхі. Другое месца атрымаў калектыў „Рамонка" з Ласінкі, а трэцяе — сямейнае трыо з Макаўкі.

Высокі ўзровень спеву паказала моладзь, што спявае ў прыхадскіх харах. Дзіцячыя і маладзёжныя прадстаўнікі прыходаў з Гайнаўшчыны і Бельска-Падляшскага спявалі наогул згодна з манерай царкоўнага спеву, на некалькі галасоў і з дапамогай дырыжораў. З ліку прыхадскіх хароў перамог хор „Васклікнавенне" прыхода Іаана Хрысціцеля з Гайнаўкі, другое месца заняў хор Дзмітрыеўскага прыхода з Гайнаўкі, а трэція месцы прысудзілі хору Прачысценскага прыхода з Бельска-Падляшскага і калектыву „Зараначка" з Ласінскага прыхода. Вылучэнне ў гэтай катэгорыі атрымаў маладзёжны хор Свята-Троіцкага сабора ў Гайнаўцы.

У час чатырох дзён калядавання ў Гайнаўскім доме культуры моцна адчуваўся настрой святаў Раждзества Хрыстовага, да якога гайнаўскія дзеткі рыхтаваліся таксама ў час заняткаў ладжаных у доме культуры яго інструктарамі і Саюзам „Любіцелі царкоўнай музыкі". У іх ходзе знаёміліся яны з калядным традыцыямі, выконвалі ланцужкі і іншыя цацкі, якімі ўпрыгожылі ёлку.

Не будзьма абыякавымі

Зіма не адпускае. Моцныя маразы і шчодры снегапад ствараюць пагрозу бяздомным і старэчам. Дзеля таго 17 снежня паліцэйсія супольна з працаўнікамі Гарадскога асяродка сацыяльнай дапамогі ў Гайнаўцы арганізавалі акцыю наведвання бездапаможных людзей.

З самага ранку функцыянеры з сацыяльнымі працаўнікамі праверылі

Фота КПП

гаражы, падвалы ды апусцелыя забудовы, у якіх ад холаду маглі хавацца людзі і прапанавалі ім магчымасць абеспячэння палівам і харчовымі прадуктамі (у выглядзе талонаў). Такія акцыі ў рамках праграмы „Не будзь абыякавы" ў Гайнаўцы праводзяцца штогод і канчаюцца пры канцы зімовага перыяду. Зараз было наведаных сорак такіх месцаў. Паліцэйскія заклікаюць: калі нехта пабачыць бяздомнага або старэчу, якія патрабуюць дапамогі, тэлефануйма пад нумар 997, 112 або 999 да хуткай дапамогі. Памятайма затым, што наш адзін тэлефон можа выратаваць чалавечае жыццё.

Святочны ўспамін

Не паспеў чалавек азірнуцца, як палова студзеня маланкай праляцела. Зараз адно можам паўспамінаць сяброўскія сустрэчы ды застолле ў сямейным крузе. Я, напрыклад, Каляды правёў у дамашнім зацішшы з дачушкамі і ўнукамі, а Шчодры вечар адзначаў „на белай зале" з Радыё Рацыя, слухаючы Навагодні канцэрт пажаданняў. І тут чакаў мяне мілы сюрпрыз. Калі ўключыў прыёмнік (перад восьмай вечара), дык пачуў віншаванні ў мой адрас ад супрацоўнікаў „Нівы". Гэта быў для мяне мілы навагодні падарунак, ды і песня спадабалася. Вось, што значыць кампанія!

„Ніву" лічу самым лепшым прыяцелем, а рэдакцыйны калектыў — другою сям'ёю. Такія не падводзяць. Журналісты наведалі мяне ў мінулым годзе пасля шпітальнага лячэння, выказалі словы спачування па прычыне смерці жонкі, ды і пра юбілей 70-годдзя не забылі. І хачу сказаць, што захаваю гэта ў сэрцы як талісман па апошнія дні свайго жыцця.

Няўдачлівы „Сільвестар"

Жыхар Чыжоўскай гміны рашыў абяспечыцца на „Сільвестра" высокапрацэнтным напіткам уласнай вытворчасці. Не пашанцавала. Гайнаўскія паліцэйскія засяклі на сядзібе ў гаспадарчым будынку пяць літраў самагонкі, чатыры літры брагі ды камплект прыбораў для самагонаварэння. Гаспадар тлумачыў, што гарэлку рыхтаваў сабе пад Новы год. Аргументацыя паліцэйскіх не пераканала і „кемлівы" селянін будзе тлумачыцца перад судом.

Уладзімір СІДАРУК

Тэкст і фота Аляксея МАРОЗА

Што з малаком? (2)

Хаця апошнімі гадамі многа нашых гаспадароў, асабліва пенсіянераў, што яшчэ абрабляюць сваю зямлю, рашылася скараціць гадоўлю кароў да мінімуму, то колькасць малака прадукаванага як на Падляшшы, так і ў цэлай Польшчы, большала. Зараз на Падляшшы прадукуецца звыш 25% краёвай вытворчасці малочнай сыравіны, а ў Польшчы ўзнікае 2% сусветнай прадукцыі малака. У нашай краіне выконваецца нават 3% сусветнай прадукцыі сыроў і 4,5% сусветнай прадукцыі сухога малака. Адбываецца гэта ў асноўным дзякуючы маладым гаспадарам, якія заняліся прадукцыяй малочнай сыравіны ў вялікім маштабе. Найчасцей бралі яны вялікія доўгатэрміновыя крэдыты пад будову новых кароўнікаў або мадэрнізацыю старых. Бывала , што звычайныя хлявы перарабляліі на прасторныя ўсярэдзіне будынкі і там таксама арганізавалі гадоўлю кароў ці цялят. Нашы земляробы, што аддалі перавагу вялікамаштабнай гадоўлі, куплялі ад вопытных жывёлаводаў больш малочных кароў-матак і стараліся як найхутчэй абаперці асноўную частку сваёй малочнай прадукцыі на кароў вядомых малочных парод. Большыя вытворцы малака ў Гайнаўскім павеце з Іванкаў, Новага Беразова, Ягаднік ці Кленік праз апошніх дзесяць гадоў грунтоўна перабудавалі свае статкі і зараз малочнасць іх лепшых кароў складае 30-40 літраў малака ўдзень (у перыядзе, калі каровы даюць найбольш малака), а не 15-25 літраў, як было раней. Канешне, вельмі вялікае значэнне побач пароды і прыроднай малочнасці кароў, маюць корм і спосаб гадоўлі.

Прадукцыя малака — цяжкая праца

Прадукцыя малака гэта цяжкая работа і таму пры народнай уладзе мала земляробаў рашалася на гадоўлю большай колькасці кароў. У многіх сёлах на Гайнаўшчыне найчасцей гадавалі па 3-4 каровы. Калі гаспадары рашаліся на гадоўлю 5-6 штук дойнага быдла, а пры гэтым яшчэ даглядалі за бычкамі і цялушкамі, гаварылася нават, што яны за працай свету не бачаць. Зараз земляробы, што гадуюць па 7-10 кароў, цялят і маладняк ад сваіх матак лічацца звычайнымі гаспадарамі. Цяпер, асабліва абрабляючы палі дрэннай якасці, цяжка трымацца стандартнай прадукцыі збожжа, бо яна маладаходная, а ў мінулым годзе на такіх палях стала нават стратнай. Адзін з выхадаў, каб пракарміць сям'ю ў такім выпадку, гэта аддаць перавагу гадоўлі быдла або свіней (хіба, што нехта накупляў і ўзяў у арэнду пад 100 ці 200 гектараў нават дрэннай зямлі і карыстаецца вялікімі еўрасаюзнымі даплатамі). Хаця раней часта бывала, што цана свініны нізка падала, а цяпер мала плацяць за малако, то нашы земляробы, якія аддалі перавагу гадоўлі, жывуць надзеяй, што ў будучыні будуць большыя эканамічныя стымулы для іх прадукцыі.

Дзякуючы больш механізаванай працы цяпер можна гадаваць больш кароў, а раней з механізацыяй было па-рознаму. Не маючы прычэпаў-падборшчыкаў, якія збіраюць сена без дапамогі людзей і паветрадувак, якімі можна яго транспартаваць уверх, трэба было многа напрацавацца пры ўборцы сена ўручную. Нават у васьмідзесятых гадах даільныя апараты былі ў многіх нашых вёсках рэдкасцю. Масава паявіліся ў нашых гаспадароў трактарныя граблі і касілкі, але на гэтым многія нашы земляробы спыніліся. Калі б сённяшняму маладому сужонству прыйшлося так, як здаралася ў сямідзесятых або васьмідзесятых гадах, даіць уручную 6-8 кароў, пачалі б маладыя скардзіцца, што ў іх дранцвеюць рукі. А калі б яшчэ прыйшлося сушыць сена 15 штукам быдла (разам з маладняком), падаючы яго віламі на прычэпу, а пасля віламі з прычэпы высока ўверх на месца яго складавання, адхацелася б маладым энтузіястам спецыялізаванай прадукцыі малака. Пры гэтым у мінулым, гаспадаруючы на 10 гектарах поля і гадуючы 4 каровы, хапала сродкаў на ўтрыманне сямейства (калі бацькі не мелі намераў будаваць дзеткам у горадзе дамоў). Цяпер, ва ўмовах рыначнай эканомікі ўсё памянялася. Маладыя гаспадары, якіх не ўспамагаюць у хаце пенсіянеры, вымушаны разгарнуць сваю прадукцыю, а ў гэтым ліку і малочную або шукаць працы па-за сельскай гаспадаркай і, абрабляючы бацькаўшчыну, толькі дапаўняць заробак.

На якую дапамогу могуць разлічваць еўрасаюзныя фермеры?

Хаця французскія ўлады, так як і польскія, тлумачаць, што не могуць многа зрабіць, каб павысіць рэнтабельнасць малочнай прадукцыі, бо яна ў еўрасаюзных умовах залежыць перш за ўсё ад рыначных правіл, то могуць больш дабіцца ва ўладах Еўрасаюза. Апошнім часам на ўзроўні еўрасаюзных камісій былі прыняты рашэнні, каб надалей даплачваць да экспарту сухога малака па-за Еўрасюз (разважалася спыненне такога фінансавання) і некаторых іншых малочных прадуктаў, так як гэта робяць Злучаныя Штаты Амерыкі ці Новая Зеландыя. Францыя і Германія, якія з'яўляюцца вядучымі вытворцамі не толькі малака, але і іншай сельскагаспадарчай прадукцыі ў Еўрасаюзе, сталі патрабаваць ад яго ўлад, каб даць большую магчымасць дапамагаць земляробам на ўзроўні сваіх дзяржаў, што да гэтай пары было жорстка абмежаванае адпаведнымі законамі. Мяркуецца, што гэтыя краіны з дапамогай іншых, якія таксама маюць вялікія дзяржаўныя бюджэты, дабіліся атрымання дазволу на большую дзяржаўную дапамогу сваім фермерам. Будуць выплачваць яе са сваіх бюджэтаў усе дзяржавы Еўрасаюза. Калі аднак у бюджэце Польшчы ў 2010 годзе будзе вялікі дэфіцыт, дык цяжка спадзявацца, што з яго пойдуць большыя грошы на такога роду дапамогу. Нават і зараз, калі ў Францыі ці Германіі непасрэдныя даплаты да апрацоўваных палёў у сярэднім большыя ўдвая чым у Польшчы, гэта робіць даход з прадукцыі малака ці збожжа ў нашай краіне меншым, чым у краінах старога Еўрасаюза. Апошнім часам у Польшчы таксама вельмі моцна абмежаваная кампенсацыя за перапродаж малочнай квоты „дзяржаве". Калі раней гаспадару, які адступаў дазвол на прадукцыю малака, плацілі з дзяржаўнага бюджэту па 1,4 злота за літр адступнога, а пасля 0,8 злота, то зараз плацяць толькі па 5 грошаў за кожны літр адступнога. У такім выпадку нашы гаспадары, што ліквідуюць малочную прадукцыю або абмяжоўваюць яе, найчасцей прадаюць адступное іншым гаспадарам, што ўзбуйняюць продаж малака. Калі на Гайнаўшчыне гаспадары аддаюць малочныя квоты ў арэнду на год, плацяць ім па 3 грошы за літр адступнога. Хаця ўжо вядуцца працы ў справе праекта ліквідацыі ад 2015 года малочных квотаў, такому рашэнню асабліва супраціўляюцца французскія фермеры, апасаючыся вялікага імпарту таннейшага малака з новых краін Еўрасаюза. Затое ў Польшчы апасаюцца, што нашы гаспадары пасля такіх змен не змогуць прадукаваць малака з прыбыткам, бо гаспадары з багацейшых краін Еўрасаюза будуць прадукаваць яго танней, карыстаючыся вялікімі ўспамогамі з дзяржаўных бюджэтаў, на што не будуць маглі разлічваць нашы земляробы.

Ёсць прыбытак у вялікіх вытворцаў малака

Гаспадары, што гадуюць вялікую колькасць кароў і ўдаецца ім сабраць якасны корм, могуць разлічваць у Польшчы на сярэднюю плату на ўзроўні звыш 90 грошаў за літр малака (хаця ёсць кааператывы, што плацяць нават па 1-1,2 злота за літр якаснага сырадою). Нашы малочныя кааператывы дакідваюць грошы да падставовай платы залежна ад колькасці прададзенага малака і гэтыя сродкі ўзрастаюць разам з ростам прадукцыі. Буйныя жывёлаводы карыстаюцца таксама больш якасным кормам і таму могуць разлічваць на прадукцыю больш якаснай малочнай сыравіны, з большай колькасцю бялку. У мінулым годзе перавага буйных пастаўшчыкоў малака над дробнымі яшчэ пабольшала, бо ў час вельмі дрэннага надвор'я дробным гаспадарам вельмі цяжка было высушыць сена. Нашы фермеры круцілі толькі крыху падсохлую траву і рабілі якасны сілас.

У выпадку прадукцыі малака, Еўрасаюз стаіць зараз перад выбарам. Фермеры з розных еўрапейскіх краін заяўляюць, што неабходна вярнуцца да больш пратэкцыйнай палітыкі або ўзнікне пагроза банкруцтва малочнай прадукцыі. Аднак гэтую палітыку крытыкуюць спажыўцы і жыхары іншых краін свету і таму хіба цяжка будзе вярнуцца да такой вялікай еўрасаюзнай дапамогі, якая была раней. Калі падлічыць мінусы і плюсы вялікай малочнай прадукцыі на ўзроўні 20-100 кароў (а тым болей у час гадоўлі яшчэ большых статкаў), яна на Падляшшы — прыбытковая.

Юрка ЛЯШЧЫНСКІ

Албанія — забытае месца Еўропы (3)

Тут мела быць база савецкага марскога флоту

Курорт замест ваеннай базы

Здалёк, з барта парома горад, куды мы плылі, выглядаў быццам яшчэ ўчора яго бамбілі. Дамы без акон, без стрэх, з рыштаваннямі, быццам бы ўласнікі збіраліся іх рамантаваць пасля землятрусу ці іншай трагедыі.

І ўжо цалкам блізка, ля самага ўваходу ў порт, зразумеў я, што не было тут бамбёжкі ні землятрусу. Проста так тут ідзе пабудова. Саранда (Santi Quaranta — саракоўка святых), бо так называецца самы вядомы і буйны курорт на Іанічным моры, гэта цяпер аграмадная пабудова. Будуюць гатэлі і пансіянаты, з акон якіх будзе прыгожы від на мора. Мабыць і таму склалася такое ўражанне. Другая прычына гэта тое, што многія пабудовы пачатыя, але па розных, здаецца фінансавых, прычынах — спыненыя. Заселены пераважна першы, зрэдку чарговыя паверхі. Паром з Корфу (найбольшы горад на аднайменным востраве, вядомым таксама пад назвай Керкіра) у Саранду плыве паўтары гадзіны, хутчэй — катэр на падводных крылах, але і цана білетаў на яго ўдвая большая. У сезоне на гэтым шляху курсіруе па некалькі паромаў і катэраў. Мне давялося падарожнічаць паромам. Ну, што ж, больш часу было, каб захапляцца прыгожымі краявідамі навокал. З аднаго боку востраў Корфу, з другога — кантынент, а што і раз мінулі або апярэджвалі нас паромы, караблі і яхты, якіх налічыў я каля паўсотні. У самым вузкім месцы праліў Керкіра (Корфу) мае няцэлыя 2,5 км. Пра прыгажосць месца няхай сведчыць тое, што ў сямідзесятыя гады здымалі тут адну з серый славутага фільма пра прыгоды супер-агента брытанскай разведкі Джэймса Бонда.

Аднадзённыя экскурсіі з Корфу ў Албанію — самая папулярная форма наведвання гэтай краіны для турыстаў, адпачываючых на гэтым востраве. Плывуць і немцы, і шведы, і славецны. Грамадзян Еўрасаюза не абавязвае візавы рэжым. Хочаш — купляеш білет і плывеш. Не тое, што ў Беларусь! Турысты з Белавежы ці Аўгустова, каб наведаць Беларусь, павінны пераадолець шмат цяжкасцей, аформіць візу, страхоўку і адчакаць пару дзён, а тут і водпуск міне!..

Зараз Саранда — самы папулярны курорт у Албаніі. Сонечных дзён тут амаль трыста ў год, а і зімою сярэдняя тэмпература паветра рэдка апускаецца да +15 градусаў. Пра снег успамінаюць тут як пра нешта такое рэдкае, як, скажам землятрусы. Хаця і тое, і тое бывае. І тады — трагедыя.

Вось галоўным пунктам такой аднадзённай экскурсіі ў Албанію было наведанне комплексу археалагічных раскопак старажытнага горада Бутрынт. Гораду гэтаму сама меней дзве з паловай тысячы гадоў. Заснавалі яго старажытныя грэкі, уладарылі ім рымляне, візантыйцы, свой след пакінула Венецыянская Рэспубліка, а апошнімі былі тут асманскія туркі. І ўсе пакінулі свой след. Грэкі — акропаль, рымляне — акведукі, візантыйцы — храмы, венецыяне — форт, а туркі — лазню. Хаця не толькі. Падзенне прынёс землятрус, так што пару стагоддзяў Бутрынт практычна не існаваў.

Але вось у канцы 20-х — пачатку 30-х гадоў мінулага стагоддзя, калі італьянскі дучэ Беніта Мусаліні задумаў адбудаваць рымскую імперыю, загадаў шукаць слядоў старажытных рымлян у розных пунктах свету. Раскопкі ў Бутрынце вялі Луіджы Марыя Угаліні і яго албанскі калега Гасан Чэка. Бясспрэчна, рымляне тут уладарылі, але горад заснавалі грэкі. І хаця дучэ страціў цікаўнасць да Бутрынта, археолагі раскопак не спынілі, відаць, палічыўшы навуку важнейшай за палітыку. Таму сёння маем адзін з лепш захаваных археалагічных комплексаў старажытнасці ў свеце. Дарэчы, магілы абодвух вучоных знаходзяцца ля самага ўваходу ў комплекс Бутрынт. Аднак толькі ў пачатку 1990-х гадоў комплекс стаў даступным для турыстаў. З 1992 г. занесены ён у Спіс сусветнай спадчыны ЮНЕСКА. Да таго часу камуністычныя ўлады Албаніі не надта ведалі што з ім зрабіць. Наведанне комплексу заняло нам 2-3 гадзіны. Калі нехта больш цікавіцца археалогіяй, дык можа правесці тут цэлы дзень, ды і гэтага будзе мала. Але і экскурсія распараджаецца сваімі законамі. Назад у Саранду ўсяго 17 кіламетраў, але аўтобус ехаў сама меней паўгадзіны. А гэта з-за дарогі. Вузкай і крутой, але з маляўнічымі краявідамі; на мора з аднаго і на возера Бутрынты з другога боку дарогі. Дарога была такая вузкая, што каб мінуцца, трэба было павярнуць з дарогі. Праўда, наш албанскі вадзіцель жартам называў яе аўтастрадай: „Гады таму два паклалі асфальт, няма дзіраў столькі!". Наогул албанскія дарогі, шафёры і машыны гэта, так бы мовіць, „масакра"! Да 1990-х гадоў у краіне ўвогуле не было прыватных машын. У 1980-я гады па вуліцах ездзіла іх менш чым у саракавыя, калі Албанія знаходзілася пад італьянскай акупацыяй. А тыя, што мчаліся, службовыя, найперш савецкія „волгі" і часткова потым нямецкія „мерседэсы", выклікалі зайздрасць і захапленне звычайных грамадзян. Таму „мерседэс" стаў марай албанца. І ўжо пасля адмены камуністычнай забароны на прыватныя машыны ў 1991 годзе ў Албанію трапіў транспарт першых аўтамабіляў. У той год прывезлі іх 17 630, пераважна „мерседэсаў", у ліхім тэхнічным стане. У выніку таго год пазней у вулічных катастрофах у самой Тыране загінула больш за дзвесце чалавек. І гэтак дзеецца да сёння. Дрэнны стан дарог, ліхая тэхнічная якасць прывезеных машын і фарсоўнасць кіроўцаў — галасней і хутчэй! — робяць сваё. Тым не менш, кіроўца нашага аўтобуса (пра сябе паўтараў ён: „I'm good driver"), у Саранду давёз нас без клопатаў. А па дарозе маглі мы любавацца прыгажосцю возера Бутрынты, слухаючы цікавы расказ шафёра пра яго. Вось літаральна 50 гадоў таму, калі Албанія была надзейным звяном сацыялістычнага лагера, гэтыя ваколіцы наведаў генеральны сакратар КПСС Мікіта Хрушчоў. Убачыўшы возера Бутрынты, выказаў „таварышу каменданту" жаданне, што на возеры варта было б стварыць базу для савецкіх ваенных падлодак. Бо і сапраўды, возера з Іанічным морам спалучана пратокай, а далей — непасрэдны выхад на Міжземнае мора, проста „супер"! Аднак, па цалкам іншых прычынах албанскія камуністы парвалі сувязі з савецкімі таварышамі, абвінавачваючы іх у адыходзе ад ідэі Маркса, Энгельса, Леніна і Сталіна. Неўзабаве Албанія выйшла з Варшаўскага дагавора, так што ідэя ваеннай базы для падлодак засталася няздзейсненай.

Грэцкая брама ў Бутрынце пратрымала землятрусы

Але з таго больш-менш часу ў Албаніі „разгарнула" дзейнасць Камуністычная партыя Польшчы ў асобе Казімежа Мілля — уцекача з ПНР. Гэтая аднаасабовая структура мела свой прэсавы орган „Чырвоны штандар", албанскае радыёвяшчанне штодзённа выпускала перадачы на польскай мове, даволі добра чутныя ў Польшчы. Дадам ад сябе, што і я слухаў быў перадач Радыё Тырана. Маючы гэта на ўвеце, уключыў я ў сваім мабільніку радыё і пашукаў мясцовых радыёстанцый. Знайшоў некалькі, і што тут гаварыць — расчараваўся. Даўняга Радыё Тырана, ад якога засталіся толькі ўспаміны, не знайшоў! Затое кожнае іншае падобнае адно на адно і на любую камерцыйную радыёстанцыю, хаця б і ў Польшчы, з той жа самай амерыканскай „музычнай сечкай". Штораз менш арыгінальнасці — падумалася мне — нават і тут!

Нараўчанская гміна

Дзе пастаянныя чытачы „Нівы"?

У Нараўчанскай гміне ёсць здаўна верныя чытачы „Нівы". Адной з іх з'яўляецца 70-гадовая Яўгенія Аліфер са Старога Ляўкова. Яна чытае наш беларускі тыднёвік ад пачатку яго існавання. Робіць гадавыя падшыўкі. Спадарыня Яўгенія зрабіла падпіску на

Фота Міры ЛУКШЫ

Яўгенія Аліфер — наша чытачка ад самага пачатку існавання тыднёвіка.

ўвесь 2010 год. Раней таксама рабіла гадавыя падпіскі.

— Калі я была малодшая, чытала ў „Ніве" ўсё, — расказвае вядомая ляўкоўская рукадзельніца і захавальніца традыцыі. — А перш за ўсё песні, „Сэрцайка" ды „Астрона", які разгадваў-рассакрэчваў сны. Але і зараз „Ніву" люблю, ад душы. Усё ў ёй мяне цікавіць.

Спадарыню Яўгенію наведаў я 28 снежня 2009 года. Была з ёй адна жанчына з вёскі Плянта. Яны на змену ткалі на кроснах ходнікі на ўпрыгожанне падлогі. Па іх ходзяць дома. Ніўская пастаянная чытачка паказала мне вытканыя ёю тканіны. Спадабалася мне і тонкая каларыстыка, і ўзоры, сярод якіх і старыя беларускія.

— Калісь на вёсцы ўсе ткалі. Ткала палатно мая мама, то і я тку, — сказала мне мая субяседніца.

27 снежня мінулага года пазваніў мне жыхар Плянты Уладзімір Клімюк. Ён — як пастаянны падпісчык на „Ніву" — штотыднёвік атрымаў ад лістаношы 24 снежня. Хваліў нумар з цікавымі артыкуламі і допісамі нястомных карэспандэнтаў. Прачытаў пра сябе!

Патэлефанаваў я Славаміру Кулешу ў Семяноўку. „Ніву" з беларускім календаром купіў ён з самай раніцы ў мясцовай краме ГСу ў Семяноўцы.

28 снежня 2009 г. быў я ў крамах у Старым Ляўкове і ў Плянце. У Старым Ляўкове прадаўшчыца атрымала 15 экземпляраў „Нівы" і ў Пляцне — 35 экземпляраў. Купіць „Ніву" з беларускім календаром прыйшлі жанчыны. Сярод іх тая, што цікавіцца ўзорамі для ручной вышыўкі (пісаў я пра яе ў 52 нумары „Нівы" — апошнім за мінулы год). Наш родны беларускі часопіс купіла.

— Беларускі каляндар 2010 года ў „Ніве" мне падабаецца. Ёсць у ім усе праваслаўныя святы, а я хаджу ў царкву і спяваю ў царкоўным хоры ў Нараўцы. Памечаны таксама і такія святы, як Дзень бабулі ці Дзень дзядулі. Павешу яго на сцяне ў сваім доме, — сказала мне кабета з Плянты.

28 снежня 2009 года апошні нумар з беларускім календаром на 2010 год прапанавала ў сваім раёне абслугоўвання лістаношка Лідзія Малішэўская. Не ведаю, ці я добра пачуў: спадарыня Лідзія сказала, што на пошту ў Нараўку даставілі 750 экземпляраў „Нівы" з 52 нумарам!

(яц)

Ганна Кандрацюк (zorka@niva.iig.pl)

зорка

для дзяцей і моладзі

„Каляда, Каляда, яко ты нам міла!”

Фота Юркі ЧЫЖЭЎСКАГА

Фота Юркі ЧЫЖЭЎСКАГА

Што сталася „Учора звячора” або чаму здарыўся „Шчодры вечар”, у пасляпасвяточны аўторак у Ваяводскім асяродку анімацыі культуры ў Беластоку распавядалі наймалодшыя. Не была гэта сустрэча з гавэндай, толькі сямейнае калядаванне. Хаця зараз пачаўся перыяд аглядаў і конкурсаў калядак, то варта ўзгадаць такія моманты, калі не дзеля спаборніцтва, а проста для радасці ад супольнай сустрэчы людзі спатыкаюцца і спяваюць.

Мілая людзям не толькі Каляда, але і само калядаванне. Паказалі гэта ў пачатку сустрэчы дзеткі з беларускага садка ў Беластоку. Нават калі часам не падалі з паўплэйбэкам, то прыемнасць ад іхніх спеваў парушыла ўсе сэрцы. Ім толькі пару годзікаў, а ўжо бяруцца за сапраўднае мастацтва. Старэйшая дашкольная група гэта ўжо амаль прафесіяналы. Не толькі спявалі, але і гралі на шматлікіх інструментах, што напэўна вельмі цешыла не толькі бацькоў, але і самога народжанага Ісуса. Пасля дзетак на сцэну выйшлі іх настаўніцы, можа і вядомыя сваёй прафесійнасцю, але пры нагодзе засаромелі напэўна некаторых сціплейшых бацькоў. На шчасце ўсім хапіла адвагі і пасля выступу нашых гімназістаў і іхніх бацькоў сцэна чакала ўжо чарговых сем’яў. Сям’я бацюшкі і сям’я бізнесмена, сям’я мастацкая ды дзеда з унучкам. У час калядавання між людзьмі няма розніц — усе спяваюць як умеюць. Дзеці, каб узрадаваць бацькоў і паказацца сяброўкам і калегам, бацькі, каб быць са сваімі дзяцьмі і адкрыць розныя таленты і, таксама, паказаць іх знаёмым.

— Мы мелі спяваць калядку нашых дзядоў, але яны пабаяліся прыехаць па гэтых заснежаных дарогах, — прызнаецца сям’я Здрайкоўскіх, — але і так паспрабуем самі заспяваць гэту дзедаву калядку.

Удалося. Здаецца, усім удалося, бо ў такой атмасферы не адчуваецца ніякай канкурэнцыі, можа толькі трывожыць маленькая ўсхаваляванасць: „Як пачаць?” Але калі ўжо пачнуць спяваць, то не хочацца канчаць. Сведчыла аб гэтым большасць твараў дзяцей, бацькоў і дзядоў. Кожны выступаў як умеў: хто спяваў, хто граў, а хто толькі... глядзеў і слухаў. Усюды чуеш гутаркі дзяцей, іхні смех, гульні, плач наймалодшых. Усе дзіцячыя эмоцыі. У гэтым прыемным гомане прайшоў адзіны такі ў годзе вечар, дзе можна было паспяваць, паесці цукерак (у выпадку дзяцей) або нават мяса, хлеба і салатаў, прынесеных бацькамі.

Несці радасную навіну іншым людзям было не толькі задачай пастушкоў, анёлаў і трох каралёў. Сёння кожны з нас можа павесяліць іншых і расказаць, што здарылася ў яслях, калі засвяцілася зорка. Кожны з нас можа стаць каляднікам.

Ілона КАРПЮК

Леў Талстой

Трое мядзведзяў

Адна дзяўчынка пайшла з дому ў лес. У лесе яна заблудзілася і пачала шукаць дарогу дадому, ды не знайшла і прыйшла ў лесе да хаткі.

Дзверы былі адчыненыя; яна паглядзела ў дзверы, бачыць — у хатцы нікога няма, і ўвайшла.

У хатцы гэтай жылі трое мядзведзяў. Адзін мядзведзь быў бацька, звалі яго Міхал Іванавіч. Ен быў вялікі і калматы. Другая была мядзведзіца. Яна была крыху меншая, і звалі яе Настасся Пятроўна. Трэці быў маленькі мядзведзік, і звалі яго Мішутка. Мядзведзяў не было дома, яны пайшлі гуляць па лесе.

У хатцы было два пакоі: сталавальня і спальня. Дзяўчынка ўвайшла ў сталавальню і ўбачыла на стале тры міскі з заціркай. Першая міска, вельмі вялікая, была Міхала Іванавіча; другая міска, крыху меншая, была Настассі Пятроўны; трэцяя, сіненькая місачка, была Мішуткава. Каля кожнай міскі ляжала лыжка: вялікая, сярэдняя і маленькая.

Дзяўчынка ўзяла самую вялікую лыжку і паела з самай вялікай міскі; потым узяла сярэднюю лыжку і паела з сярэдняй міскі; потым узяла маленькую лыжачку і паела з сіненькай місачкі, і Мішуткава заціркa ёй здалася найсмачнейшая.

Дзяўчынка захацела сесці і ўбачыла ля стала тры крэслы: адно вялікае — Міхала Іванавіча, другое, крыху меншае — Настассі Пятроўны і трэцяе, маленькае, з сіненькаю падушачкай — Мішуткава. Яна палезла на вялікае крэсла і ўпала; потым села на сярэдняе крэсла — на ім было нязручна; потым села на маленькае крэселка і засмяялася — так было добра. Яна ўзяла сіненькую місачку на калені і пачала есці. З’ела ўсю заціркy і пачала гушкацца на крэсле.

Крэселка паламалася, і яна ўпала на падлогу. Яна ўстала, падняла крэселка і пайшла ў другі пакой. Там стаялі тры ложкі: адзін вялікі — Міхала Іванавіча, другі сярэдні — Настассі Пятроўны, трэці маленькі — Мішуткаў. Дзяўчынка лягла на вялікі — было надта раскошна; лягла ў сярэдні — было занадта высока; лягла ў маленькі — ложачак падышоў якраз для яе, і яна заснула.

А мядзведзі прыйшлі дадому галодныя і захацелі абедаць. Вялікі мядзведзь узяў сваю міску, зірнуў і зароў страшэнным голасам:

— Хто еў у маёй місцы?

Настасся Пятроўна паглядзела ў сваю міску і зараўла не так моцна:

— Хто еў у маёй місцы?

А Мішутка ўбачыў сваю пустую місачку і запішчаў тонкім голасам:

— Хто еў у маёй місцы і ўсё з’еў?

Міхал Іванавіч зірнуў на сваё крэсла і зароў страшэнным голасам:

— Хто сядзеў на маім крэсле і зрушыў яго з месца?

Настасся Пятроўна зірнула на сваё крэсла і зараўла не так моцна:

— Хто сядзеў на маім крэсле і зрушыў яго з месца?

Мішутка зірнуў на сваё зламанае крэселка і прапішчаў:

— Хто сядзеў на маім крэсле і зламаў яго?

Мядзведзі прыйшлі ў другі пакой.

— Хто клаўся на маю пасцель і скамячыў яе? — зароў Міхал Іванавіч страшэнным голасам.

— Хто клаўся на маю пасцель і скамячыў яе? — зараўла Настасся Пятроўна не так моцна.

А Мішутка падставіў услончык, палез у свой ложачак і запішчаў тонкім голасам:

— Хто клаўся на маю пасцель?..

І раптам ён убачыў дзяўчынку і запішчаў так, як быццам яго рэжуць:

— Вось яна! Трымай, трымай! Вось яна! Вось яна! А-я-яй! Трымай!

Ён хацеў яе ўкусіць. Дзяўчынка расплюшчыла вочы, убачыла мядзведзяў і кінулася да акна. Акно было адчыненае, яна выскачыла ў акно і ўцякла. І мядзведзі не дагналі яе.

Трасцянка

На Падляшшы вёсак з прыгожай і багатай архітэктурай шмат. З іх ліку варта ўспомніць Трасцянку, што ў Нарваўскай гміне. Пераязджаючы праз гэтую вёску, распаложаную пры дарозе паміж Нарвай і Заблудавам, цяжка не звярнуць увагі на яе драўляныя хаты ды прыгожую драўляную царкву.

Цікава, што мясцовасць раней не называлася так як сёння. У старадаўніх дакументах стаіць назва Трасцяніца. У XVI стагоддзі была яна сядзібай войтаўства.

Царква ў Трасцянцы існавала ўжо ў XVII стагоддзі, але пасля пажару ў пачатку XIX стагоддзя прыход быў далучаны да суседніх Пухлаў. У 1867 годзе ізноў пабудавалі царкву святога Міхала. У гэтым жа самым стагоддзі Трасцянку расславіла царкоўна-настаўніцкая школа, якая знаходзілася ва ўрочышчы Ставок. Вялікая частка заняткаў у ёй адводзілася агракультуры.

Сёння, у параўнанні з іншымі падляшскімі вёскамі, Трасцянка даволі вялікая. Яе характэрнай рысай, апрача царквы, з'яўляюцца прыгожа аздобленыя хаты. Цікава, што ў вёсцы жывуць яшчэ майстры, якія робяць шыкоўныя выразкі, якімі можна ўпрыгожыць хату.

Якраз Трасцянка і яе архітэктура з'яўляюцца часткай маленькага, але вельмі вартаснага шляху „Краіна адкрытых аканіц". Некалькі гадоў таму, дзякуючы гэтаму праекту жыхары, між іншым, Трасцянкі змаглі адрамантаваць ці проста адмаляваць драўляныя ўпрыгожанні сваіх дамоў. Цяпер, пераязджаючы праз Трасцянку, можна пабачыць і палюбавацца ўмеласцямі майстроў, якія стваралі на нашых беларускіх землях.

Міхасць СЦЕПАНЮК

Беларусь вачыма нашых школьнікаў!

З цікавасцю я адкрыла кніжачку-буклет „Пазнай Беларусь", у якой сачыненні, вершыкі і малюнкі дзяцей і моладзі. І адразу звярнула ўвагу на малюнкі, асабліва малеч з Беластока і Гарадка. Тут найбольш малюнкаў з зубром. Дзікія жыхары пушчы паказаны раз у цёплых колерах і сямейнай кампазіцыі, іншы раз яны непрыступныя і вольныя як сапраўдныя ўладары лесу. Сярод сачыненняў спадабалася мне „Мая вёска, мая сям'я" Аніты Яблушэўскай з Бельска-Падляшскага. Калі Аніта піша, што ў яе хаце шануюць мову і продкаў, гутараць пра гісторыю, я веру ў словы аўтаркі. Тая пашана адчуваецца ў яе расказе і ў культуры слова. Тут спатыкаем рэдкую для аўтараў буклета індэнтыфікацыю з Беларуссю. Для Аніты Беларусь пачынаецца за парогам яе хаты. Пераважная большасць маладых аўтараў ці мастакоў падпіраецца не сямейнай гісторыяй ці родным пейзажам, толькі карцінамі, якія запамяталі з падарожжа ў Беларусь. Прыкмета „турыстычнага" назірання тут такая паўсюдная, што аж трывожыць. Беларусь для іх гэта чужая хоць мілая сэрцу

краіна. Трывожыць таксама кароткая памяць конкурснікаў — амаль усе аўтары свой радавод выводзяць ад прадзеда і прабабы. А тут выпадала б пачынаць хоць бы ад стагоддзя, у якім узнікла іх мясцовасць. На Падляшшы сустрэнем мясцовасці якім за тысячу гадоў (напрыклад, Драгічын ці вёска Жэрчычы ў Нурэцкай гміне). Слушна заключае свой сямейна-патрыятычны аповед Таня Калеснік, гімназістка з Ваўкавыска, словамі: **„Каб застацца Чалавекам, трэба ведаць гісторыю продкаў".**

Так ці інакш вітаем ідэю Культурнага цэнтра Беларусі ў Беластоку. Зараз ажыццяўлецца другі выпуск Конкурсу „Пазнай Беларусь", які бясспрэчна пашырае далягляды падляшскага школьніка. Арганізатар, Культурны цэнтр Беларусі, спакушае каштоўнымі ўзнагародамі. Напэўна адной з іх будзе кніжнае каляровае выданне з конкурснымі сачыненнямі і малюнкамі. Гэтая кніжачка, з цягам гадоў, набярэ для вас нечаканай каштоўнасці. Вядома, калі далей будзеце жадаць „Пазнаваць Беларусь".

ЗОРКА

Музыка з кайфам

Анёлкі — ужо на зямлі

Каму казала мама або бабуля, што анёлкі лётаюць у небе? А каму казалі, што анёлкі садзяцца на Зямлю? А камусьці можа казалі, што анёлкі жывуць між намі? Усё гэта праўда! На Каляды, 7 студзеня, на гэты раз у Мінску прызямліліся ўсялякія анёлкі: ахоўнікі, турысты, музыканты, анёлак Вася і зямны анёлак — цяжка іх ажно пералічыць. Стварыў анёлкаў Арцём Кавалеўскі, паэт і перакладчык. Спачатку ў сваім уяўленні, а пасля, як не дзіўна, анёлкі трапілі ў рукі Зміцера Вайцюшкевіча. Зразумела, не прыдушыў ён іх сваімі рукамі, а проста прыдумаў мелодыі, на якія спяваецца пра анёльскія заняткі, турботы і радасці. Такім чынам узнік альбом *„Мой сябра Анёлак"*.

Зміцер Вайцюшкевіч (на здымку), прадусар альбома і аўтар музыкі, запрасіў да супольнай працы вядомых выканаўцаў, у асноўным маладога пакалення, якія змагаліся з новай канцэпцыяй: заспяваць адначасова для дзяцей і для дарослых. Наста Некрасава, напрыклад, пастаралася спяваць больш па-дзіцячаму, каб аддаць атмасферу праекта, але ўжо жонка Зміцера, Галіна Казімяроўская, праспявала вельмі сур'ёзна, настолькі сур'ёзна, што, паводле меркавання яе і яе мужа, атрымалася сапраўдная поп-балада. Нягледзячы на імкненні, атрымаўся вельмі разнародны, цікавы альбом, якога фактычна прыемна паслухаць і старэйшым, і дзецям. Дарэчы, у якасці маленькага хору спяваюць на дыску вельмі маладыя выканаўцы, сярод іх і паўгадовы сынок аўтара. Але можна сустрэць таксама і іншых. Музычную альтэрнатыву прэзентуе Бенька, вакалістка вядомай „Серебряной свадьбы", бардаўская плынь у музыцы пранікла дзякуючы Алесю Зайцаву з „Босага сонца", тэатральным духам забаўляе нас Ганна Хітрык з „Дзеці дзяцей" ці Мікола Прылуцкі з Тэатра імя Янкі Купалы. Калі хочаце пазнаць жыццё анёлкаў, варта заглянуць на сяброўскі сайт http://anelak.todar.net/, дзе выкладзены ўсе песні — усё для вашай прыемнасці!

i_basovka@o2.pl

Польска-беларуская крыжаванка № 4

Запоўніце клеткі беларускімі словамі. Адказы, з наклееным кантрольным талонам, на працягу трох тыдняў дашліце ў „Зорку". Тут разыграем цікавыя ўзнагароды.

Адказ на крыжаванку № 52:

Сказ, кура, пас, агул, снежань, альт, агонь. Клас, снег, кажан, вугаль, рунь, сальта.

Узнагароды, капамакт-дыскі з беларускай музыкай, выйгралі **Яраслаў Нічыпарук, Радаслаў Сідарук, Эвеліна Клімук, Войцех Лаўрыновіч, Наталля Семяцкая** з Новага Корніна, **Дарыюш Багроўскі** з Дубіч-Царкоўных. Віншуем!



Ігар Сідарук

ВЫДАЛЯЮЧЫ СМС, НЕ ПАКІНЬ ДУШУ Ў ФІЛЬТРАЦЫІ...

І былі Каляды, быў Новы год, а ён — Дзедам Марозам.

Скончыліся заняткі, усе разышліся; а яна — яна стаяла ля ахінутай блакітным дзіўноцтвам ялінкі каля ўніверсітэта і проста чакала яго. Салодка-неверагодным снегам пахлі потым яе тонкія пальчыкі, іх усмешкі мяшаліся з электрычнасцю, месяцавым святлом, вулічнай гарадской віхурнасцю, а вочы шукалі адзін аднаго, знаходзілі і ўспыхвалі — жартам і ўсур'ёз, прыцішана і зорным россыпам.

І ён — быў, быў Дзедам Марозам!.. і, запрашаючы ў крамы і крамкі, дарыў ёй экзатычныя фрукты, мілага цацачнага сабачку і чорны гарнітур шыкоўнай бялізны, акуратны залаты пярсцёнак з фенітам і чорныя панчошкі.

Яна ніколі не дазваляла браць сябе на рукі; але на стале аблівалася палаючымі слязьмі свечка, і была яна ў гэтым шыкоўным гарнітуры, у гэтых эратычных чорных панчошках, яе скура пахла аранжыкамі, і была яшчэ музыка (адкуль бралася тая музыка?!); і бясконцы, бясконцы, бясконцы танец канчаткова рабіў іх вар'ятамі.

Так, танчыў ён дрэнна, няўмела, нават крыху саромеўся; але ў тую дзіўную, маўклівую ноч яны разам крыху саромеліся, хоць і былі — самай загадкавай, самай адчайнай і нечаканай параю. А потым — потым яна хацела ўсё ж палічыць, колькі сабраў для яе гэтых дзіўных, залаценькіх, мігатлівых і радасных зорачак з неба — ды не змагла, паколькі даволі шмат іх закацілася ёй у панчошкі, захавалася паміж грудак, лягло між лапаткамі і сцішылася пад пашкамі, і ўжо яму давялося збіраць іх вуснамі, рукамі, лёгкімі дотыкамі свайго не звыклага да пяшчоты мужчынскага сэрца.

А наступным днём, калі зноў былі заняткі, ён зноў чакаў. Чакаў, паколькі абяцаў, паколькі проста хацеў дачакацца. А чакаючы, нешта рабіў, кудысьці ішоў, у нейкай задумёнасці выдаляў прысланыя ёй учора мілыя смс. І зноў нешта рабіў, зноў чакаў.

Так надышоў вечар. Тэлефон маўчаў, паведамленні не прыходзілі; ён не рызыкнуў набраць ці напісаць першым. Даўно скончыліся заняткі...

Праз дзве гадзіны ён з'ехаў.

Наступным днём, маўклівы, самотны, засяроджаны, перабіраючы ўпоперак, уздоўж і зваротна ўсё начынне свайго мабільніка, раптам знайшоў, не паверыўшы спачатку вачам, ейны нумар у фільтрацыі, у спісе „забароненых". І адразу ўспомніўся ўчарашні вечар, тая дурнаватая задумёнасць, яго няўцямныя манеўры з эсэмэскамі...

Адкрыўшы адфільтраваныя, пабачыў адразу чатыры смс, падпісаныя ейным імем. Спачатку хацеў адразу прачытаць. Ды раптам, нечаму ціха і горка ўсміхнуўшыся, рашуча выдаліў, адно за адным. Выдаліў, так і не адкрыўшы і не прачытаўшы: „Мілы мой Дзед Мароз! Чакай мяне ў 21.00 пад той жа ялінкай. Твая Снягурка". „Я хачу... яшчэ адзін падарунак... такую ж ноч!.." — „Дзе ты? Што-небудзь здарылася?" — „Ты маўчыш... Чаму ты маўчыш?"

А потым пайшоў варыць сабе сваю адзінокую каву.

А яна — яна болей ніколі не пазваніла і не напісала.

04.02.2009

Інстытут дэмакратычных змен

Тэкст і фота Мацея ХАЛАДОЎСКАГА

Дэкларацыю аб намерах заснавання Згуртавання „Дэмакратычны інстытут" падпісалі ў Белавежы ў першым сёлетнім „Дні салідарнасці з Беларуссю" (16 студзеня) лідары чатырох беларускіх моладзевых палітычных арганізацый і Маладых дэмакратаў — моладзевай структуры Грамадзянскай платформы.

Дзякуючы гэтаму моладзевыя арганізацыі з Беларусі змогуць весці легальную і шырокую дзейнасць у краінах Еўрасаюза („у рэаліях дэмакратычнай прававой дзяржавы"), з чым маюць праблемы ў сваёй краіне, уключна з арыштаваннямі сваіх членаў.

Падпісантамі дэкларацыі з'яўляюцца прадстаўнікі Маладой Беларусі, Маладога фронту, Маладых дэмакратаў Беларусі і Маладых Беларускага народнага фронту. Свой подпіс паставілі таксама падляшскі дэпутат ад ГП Роберт Тышкевіч — віцэ-старшыня сеймавай камісіі замежных спраў і Владзімеж Кусак — старшыня Гарадской рады г. Беластока. Як тлумачылі маладыя падпісанты дэкларацыі, іх вялікай марай з'яўляецца тое, каб „Беларусь і іншыя краіны былога Савецкага Саюза далучыліся ў будучыні да еўрапейскай супольнасці, якой Польшча з'яўляецца паўнапраўным членам з 2004 года. Мары можна рэалізаваць толькі дзякуючы прамоцыі еўрапейскай інтэграцыі, развіццю кантактаў і супрацоўніцтву паміж грамадствамі ды актывізацыі адзінак, арганізацый і ўстаноў на абшары грамадскай дапамогі. Каб зрэалізаваць гэтыя смелыя мэты, Дэмакратычны інстытут будзе іх рэалізаваць у галіне ведаў аб дэмакратычнай прававой дзяржаве, папулярызуючы прынцыпы дэмакратычнай прававой дзяржавы шляхам распаўсюджвання ведаў аб правах і абавязках грамадзян, інфармавання аб функцыянаванні органаў ЕС і польскай дзяржавы. Інстытут будзе таксама надзяляць арганізацыйнай, тэхнічнай і інтэлектуальнай дапамогай асобы і арганізацыі, якія займацца будуць дзейнасцю дзеля актыўнага ўдзелу ў грамадзянскім жыцці, развіцці дэмакратыі і грамадскай дапамозе". Згодна з дэкларацыяй аб намерах ДІ будзе рэалізаваць свае мэты шляхам м.інш. публікавання матэрыялаў, арганізавання дакладаў, семінараў, сімпозіумаў, канферэнцый, аказвання парад і кансультацый у абсягу развіцця грамадскай актыўнасці, арганізавання і вядзення абучэнняў, практык і краёвых ды замежных стажыровак.

Ініцыятары заснавання Інстытута паставілі сабе адну з найважнейшых мэт: дапамогу ў падрыхтоўцы еўрасаюзных праектаў і арганізаванне агульнаеўрапейскіх акцый для развіцця дэмакратыі ў Беларусі, а таксама стварэнне еўрапейскіх партнёрскіх сетак.

Роберт Тышкевіч, звяртаючыся да пятнаццаці маладых людзей з Беларусі і прадстаўнікоў Маладых дэмакратаў — моладзевай структуры ГП, сказаў:

— Выбралі мы на месца сустрэчы таксама сімвалічную Белавежу, дзе калісьці непадалёк быў распушчаны Савецкі Саюз. Папярочка, значыць, завешана на высокім узроўні і разумею, што з добрым духам Белавежскай пушчы пачынаеце гэтае мерапрыемства.

Адзначыў:

— Для паспяховасці дзеянняў дэмакратычнага асяроддзя ў Беларусі, дзеяння моладзевых асяроддзяў і ўвогуле адкрытага грамадства неабходнымі з'яўляюцца пошукі адпаведных добрых, сучасных прылад, якія дазваляюць поўнасцю пакарыстацца магчымасцямі, якія дае Еўрасаюз, міжнароднае супрацоўніцтва. Так я разумею гэтае мерапрыемства (...). Польшча стараецца быць амбасадарам беларускіх спраў у Еўропе. Стараемся, каб гэтая еўрапейская палітыка заключалася ў тым, што з аднаго боку прыцягваем улады Беларусі да дыялогу і стараемся праз гэта ўплываць на іх палітыку. Але з другога боку намерваемся — і мусім гэта працягваць — падтрымліваць усе дэмакратычныя асяроддзі. Інстытут можа быць гэтым інструментам, які таксама ўпісваецца ў гэтую стратэгію.

Марэк Зюлькоўскі дэкларараваў супрацоўніцтва з ДІ польскага МЗС:

— Нашы добрасуседскія стасункі могуць быць фактычна настолькі добрасуседскімі, наколькі дэмакратычны лад пануе ў абедзвюх суседскіх краінах.

Дарыюш Дальчэўскі, старшыня агульнапольскіх структур Маладых дэмакратаў ГП заявіў:

— Мне хацелася б, каб Дэмакратычны інстытут спрычыніўся да таго, каб і вы таксама праз пару гадоў маглі адзначаць нейкі юбілей атрымання незалежнасці пасля падзення рэжыму Лукашэнкі, так як Польшча летась святкавала 20 гадавіну перамогі над камунізмам. Нашай мэтай з'яўляецца перадача вам нашага вопыту так, як мы 20 гадоў таму карысталіся досведам нашых саюзнікаў з Захаду, асабліва Францыі. Здаецца, што шлях, які выбрала ў той час Польшча, з'яўляецца слушным — гэта шлях грамадзянскай рэвалюцыі.

Старшыня Радыё Рацыя Яўген Вапа пажадаў маладым людзям з Беларусі, каб не паўтаралі падобных памылак, якія здараліся грамадзянам Польшчы ў дэмакратычнай барацьбе ў васьмідзесятых гадах.

У сваю чаргу, падобна як іншыя маладыя беларусы, Антон Каліноўскі, намеснік старшыні па міжнародных справах Маладых БНФ, звярнуў увагу:

— Вельмі важнай справай з'яўляецца ваша дапамога, заадно як маральная, так і дзяржаўных устаноў.

Зміцер Каспяровіч, старшыня руху Маладая Беларусь, адзін з галоўных арганізатараў сустрэчы, адзін з былых палітвязняў за дзейнасць у выдуманай нелегальнай арганізацыі, пераконваў:

— З-за сусветнага крызісу прэзідэнт Лукашэнка абвясціў г.зв. лібералізацыю. Меў гэта быць сігнал Еўропе, што Беларусь гатова да супрацоўніцтва. Шматлікія еўрапейскія краіны ў гэта паверылі. Няма, аднак, рэальных і радыкальных змен, а толькі касметыка (...). Лукашэнка выпусціў з турмаў некалькіх палітвязняў, ды пасадзіў новых (...). Праз год у Беларусі адбудуцца прэзідэнцкія выбары. Вядома, што Лукашэнка хоча быць пры ўладзе пажыццёва, а пасля аддаць уладу сыну. Разумею, што толькі масавы выхад на вуліцы, масавае грамадзянскае непаслушэнства можа змяніць гэтую сітуацыю так, як ва ўкраінскім варыянце. Існуе небяспека, што па прычыне г.зв. лібералізацыі еўрапейскія краіны могуць палічыць Лукашэнку легальна выбраным прэзідэнтам.

Прытым дадаў:

— Верым, што дэмакратыя прыйдзе ў Беларусь, да таго раней, чым мы думаем.

У размове з „Нівай" Караль Пілецкі, лідар падляшскіх Маладых дэмакратаў ГП прадбачыў, што сядзіба Дэмакратычнага інстытута будзе размешчана ў Беластоку і, мабыць, у будынку няўрадавых арганізацый па вуліцы Святога Роха.

Рэзюмэ даклада Аксаны Харчэнкі, зачытанага 26 лістапада 2009 года на навуковай канферэнцыі „Рэлігійныя перамены на Беларусі"

Арганізацыя царкоўнага жыцця ў Беларусі з верасня 1939 да чэрвеня 1941 года

Пасля падзей 1917 года Праваслаўная царква апынулася ў цэнтры цалкам новых гістарычных і палітычных працэсаў. Прыход да ўлады ў Расіі бальшавіцкай партыі з яе антырэлігійнай накіраванасцю і праводжаная гэтай уладай жорсткая палітыка ў адносінах так да Праваслаўнай царквы, як і Каталіцкага касцёла ды іншых рэлігійных суб'ектаў стварылі пагрозу знікнення рэлігіі ў камуністычнай дзяржаве. Паводле даных магілёўскага каталіцкага біскупа Неве з 1936 года, з ліку 853 каталіцкіх святароў у СССР асталося толькі 16; звыш трохсот біскупаў і ксяндзоў былі расстраляны, дзейнічала толькі трыццаць касцёлаў і капліц. Аднак цэрквы не толькі выжылі ў надзвычайных умовах, але ўдалося ім вярнуць на сваё ўлонне многіх страчаных за той час дзетак.

Руская праваслаўная царква ва ўсходняй, савецкай частцы Беларусі вынесла на сабе непасільнае ярмо дзяржаўнай антыцаркоўнай палітыкі. Паводле захаваных дакументаў, толькі на тэрыторыі савецкай Беларусі з 1022 дзеючых 1 студзеня 1930 года храмаў на працягу двух наступных гадоў былі закрыты і перададзены на г.зв. культурныя і гаспадарчыя патрэбы 573 з іх ліку. І хаця наяўнасць непасрэднай граніцы з Польшчай і прымушала савецкія ўлады праводзіць тут больш памяркоўную рэлігійную палітыку, гэтыя абставіны не перашкодзілі бальшавікам поўнасцю аграбіць беларускія храмы і засеяць зярняты атэізму ў душы новых пакаленняў грамадзян краіны саветаў.

У 1939 годзе наступіла змена курсу дзяржаўнай рэлігійнай палітыкі, закончыўся дзесяцігадовы перыяд адкрытага наступлення на цэрквы. Пераломным момантам стаў уваход савецкіх войск на тэрыторыю Польшчы і далучэнне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны ў склад СССР. Прычыны гэтай змены былі і міжнародныя, і ўнутраныя.

Па-першае: палітыка ваяўнічага атэізму не дасягнула сваёй галоўнай мэты — поўнага выцяснення рэлігіі. Удава па Леніне Крупская тлумачыла такую з'яву тым, што з-за нецікавасці тэатральнага рэпертуару людзі сталі зноў наведваць цэрквы. Вітальнасць рэлігіі ў той час пацвярджаюць не толькі вынікі перапісу насельніцтва, але і даследаванні гісторыка Уладзіміра Зензінава. Прагледзеўшы пісьмы, знойдзеныя фінамі ў кішэнях забітых у ходзе савецка-фінскай вайны 1939-1940 гадоў чырвонаармейцаў, вучоны сцвердзіў фіяска антырэлігійнай прапаганды ў СССР. Толькі ў адным пісьме салдат быў абыякавы да рэлігіі, а асноўная маса лістоў заключала надзею на Божую спагаду і бацькоўскае блаславенне.

Па-другое: надыходзячая вайна патрабавала грамадскага адзінства заміж атмасферы ўнутраных тусовак, спараджаных нападамі на веруючых.

Па-трэцяе: паявілася інтрыга выкарыстання патрыярхіі для распаўсюджання савецкага ўплыву на мільёны праваслаўных жыхароў на далучаных у 1939-1940 гадах да Савецкага Саюза тэрыторыях; улічваўся тут і спрыяльны саветам факт дыскрымінацыі польскімі ўладамі Праваслаўнай царквы.

У былой усходняй частцы Польшчы аставалася семярых праваслаўных архірэяў, якія стварылі клопаты Маскоўскай патрыярхіі. Справа ў тым, што яны ў розны паслярэвалюцыйны час заявілі пра сваю царкоўную самастойнасць. Цяпер жа, у новых палітычных абставінах, трэба было гэта змяніць. Патрыяршы месцаахоўнік, мітрапаліт Сергій (Старагародскі) рашыў узяць мясцовае царкоўнае жыццё пад свой кантроль. Свой пункт гледжання на гэтую справу выявіў ён у лісце да іншага епіскапа: „Нашы новыя тэрыторыі прымушаюць нас непакоіцца. Новая лата не заўсёды прыстае да старой вопраткі. Усё ў іх інакш. Асабліва цяжка ім давесці, што на царкоўнай мове ранейшая іх аўтакефалія называецца расколам, з усімі з гэтага высновамі, што паводле канонаў, ні на што яны не маюць права разлічваць. Многа яшчэ давядзецца з імі памучыцца, утлумачваючы табліцу множання". Важнасць пастаўленай савецкімі ўладнымі органамі задачы падкрэслівае той факт, што ў далучаныя беларускія і ўкраінскія землі былі высланы два з чатырох уцалеўшых да 1939 года расійскіх архірэяў...

Пра дынаміку царкоўнага жыцця на далучанай да Савецкага Саюза тэрыторыі сведчыла колькасць багаслоўскіх школ. Напрыклад, у Эстоніі была духоўная семінарыя ў Пячорах і праваслаўны багаслоўскі факультэт у Тартускім універсітэце, у Латвіі — духоўная семінарыя ў Рызе і праваслаўная секцыя пры пратэстанцкім факультэце Рыжскага ўніверсітэта. У Бесарабіі была духоўная семінарыя ў Кішынёве, а ў Паўночнай Букавіне — духоўная семінарыя ў Чарнаўцах. Былі яшчэ дзве духоўныя семінарыі: у Крамянцы і Вільні ды дзве школы псаломшчыкаў — у Крамянцы і Жыровічах.

Калі гаварыць пра каталіцкія і ўніяцкія храмы і манастыры, то іх таксама было многа; на тэрыторыі Заходняй Беларусі было шэсць тысяч касцёлаў, дзевяць тысяч святароў і дваццаць тысяч манахаў. Польскі даследчык Веслаў Мыслэк падлічыў, што ў Беластоцкім, Віленскім, Навагрудскім і Палескім ваяводствах у 1939 годзе было 5018 каталіцкіх парафій; католікаў і ўніятаў было пад восем мільёнаў. Савецкая ўлада прызнавала, што тут уплыў духавенства намнога мацнейшы, чым у іншых абласцях Савецкага Саюза, таму рэкамендавалася праводзіць тут больш асцярожную канфесійную палітыку. Вось галоўны бязбожнік краіны, як яго называлі, Емяльян Яраслаўскі (у сапраўднасці Міней Ізраілевіч Губельман — А. В.) прызнае той факт рэлігійнасці і патрэбу праводзіць асцярожнейшую палітыку.

Бывалі асобныя выпадкі, калі святары агітавалі прыхаджан за супраціўленне праводжаным савецкай уладай мерам. Святары заклікалі яднацца вакол Царквы, каб арганізавана выступіць з пратэстам супраць аблажэння служыцеляў культу налогамі. Такія дзеянні не мелі агульнай падтрымкі ў праваслаўнага кліру. У некаторых прыходах прыхаджане самі збіралі сродкі на аплату празмерных налогаў святароў. У адным з прыходаў каля Баранавіч быў зроблены перапіс вернікаў з адначасовым зборам у іх сродкаў на заплату налога. У адным з прыходаў у Лунінецкім раёне святар арганізаваў збор 10-15 рублёў ад кожнага сялянскага двара. Энкавэдзісты арыштоўвалі ініцыятараў гэтых акцый і бралі на заметку так агітатараў, як і ахвяравальнікаў.

У такой складанай сітуацыі праваслаўнае духавенства звярталася за тлумачэннямі ў епархіяльную ўправу, якая была ў Жыровічах, а архімандрыт Венядзікт заклікаў плаціць налогі па меры магчымасцей і не сабатажнічаць — дрэнны будзе той пастыр, які адмовіцца ад свайго пастырскага крыжа. Царкоўнаслужыцелі і царкоўныя актывісты слалі пісьмы з подпісамі прыхаджан у адрас Сталіна, у адрас савецкага кіраўніцтва. Прывяду яшчэ ўспаміны епіскапа Мітрафана Зноскі: „Хутка пачулі мы руку савецкай улады. Нас пазбавілі магчымасці карыстацца вадой з нашай студні, мы вымушаны былі хадзіць па ваду за два кварталы. А ўсе царкоўнаслужыцелі былі кліканы ў НКВД у цывільных касцюмах. А я з'яўляўся ў НКВД — усяго чатыры разы — у рызе і з крыжам на грудзях; магчыма, што гэта паратавала мяне ад частых выклікаў". Прызнаўся ён яшчэ, што органы НКВД схілялі яго да агентурнай працы.

Савецкая прапаганда цвердзіла, што царкоўнікі ўсіх масцей у новых абставінах крышку перастроіліся, прыстасаваліся, відазмянілі формы сваёй дзейнасці. Асабліва актыўнае змаганне яны вялі за ўплыў на моладзь і дзяцей. Антысавецкай работай, па меркаванні мясцовых партыйных структур, займаліся каталіцкія святары. Яны збіралі ў сябе дзяцей і чыталі ім Евангелле або навучалі іх малітвам. Напрыклад, у Сухаволі ксёндз рэгулярна ладзіў дзецям каля касцёла фізкультурныя гульні, а ў касцёле праводзіў дзіцячыя вечарыны. А ксёндз Вішнеўскі ў дзядзінцы касцёла ў Чыжаве ладзіў дзецям гульні з мячам, у шашкі, даміно, у часе якіх навучаў дзяцей малітвам. 11 красавіка 1941 года ў адной са школ Стаўбцоўскага раёна ксёндз даручыў адной з вучаніц 10-га класа збіраць подпісы вучняў школы за тое, што ў каталіцкі Вялікдзень яны заміж прыходзіць у школу, пойдуць у касцёл. Яна ўспела сабраць подпісы пятнаццаці вучняў старэйшых класаў, калі збіранне іх было сарвана, бо іншая вучаніца той жа школы, полька па нацыянальнасці, якая раней была падала заяву пра ўступленне ў камсамол, паведаміла пра гэтую акцыю дырэктару школы. І пачалося следства для высвятлення, хто з тых вучняў падпісаўся. У Шчучынскім раёне, у сувязі з перапісам быдла ксёндз зарэзаў сваю карову і мяса раздаў сялянам бясплатна, намагаючыся такім чынам здабыць сабе аўтарытэт. Царкоўнікі прыстасавалі багаслужэнні ў касцёлах да рабочага часу устаноў і прадпрыемстваў. У выхадныя дні касцёлы былі адкрыты цэлы дзень. У палове 1940 года, пасля публікацыі ўказа аб увядзенні васьмігадзіннага рабочага дня, праз некалькі дзён змяніліся і гадзіны службаў у касцёлах: рана яны пачыналіся на гадзіну раней, вечарам — на гадзіну пазней. У выніку ў шэрагу мясцовасцей вырасла наведванне багаслужбаў у касцёлах ды ўплыў ксяндзоў на бацькоў і дзяцей. Такая дзейнасць лічылася незаконнай і перасякалася савецкімі органамі. І пропаведзі мелі антысавецкі характар, напрыклад згаданага ксяндза Вішнеўскага, які 27 лістапада 1940 года пазволіў сабе сказаць наступнае: „Ёсць дзяржава, якая не прызнае рэлігіі, такія дзяржавы намагаюцца зрабіць людзей няверуючымі ў Бога. Але ніводная дзяржава ніколі не бывае вечнай; яна змяняецца па Божай волі. Пагляньце на гісторыю дзяржавы Бісмарка і іншых паноў — іх дзяржавы змяняюцца, але каталіцкая рэлігія заўсёды адна. Яна была і будзе на векі вечныя. Колькі не было ўзаемных войнаў паміж дзяржавамі, але наш Бог не ваюе ні мячом, ні агнём, а ваюе словамі і вера Ягоная вечная. Веруючыя католікі павінны аб'яднацца і маліцца за імя вялікага мучаніка Ісуса Хрыста (...) Нашы дзеці павінны верыць у Бога так як і мы; яны павінны быць веруючымі католікамі".

Апрача слання скаргаў у органы савецкай улады прыхаджане ладзілі шэсці з адпраўленнем дэлегацый у абарону сваіх святароў; такое здарылася ў Ганцавічах. Да сакратара райкама партыі з'явілася дэлегацыя з патрабаваннем адпусціць арыштаванага ксяндза. Католікі горада хацелі паслаць у выканкам шматлюдную дэлегацыю дзеля паніжэння налогаў, аднак сам ксёндз быў супраць гэтай акцыі. Ксяндзоў прыцягвалі да такіх прац як будаўніцтва дарог і працы пры вырубе лясоў.

Савецкія органы ўлады аспрэчвалі ўсялякія паведамленні замежных сродкаў масавай інфармацыі пра праследаванні і ганенні веруючых католікаў. Емяльян Яраслаўскі пісаў, што дагэтуль „эти мракобесы продолжают влиять на население будто советская власть закрывает все церквы, запрещает молится, преследует за веру. Этим занимаются и вражие агентуры Ватикана и зарубежная печать, особенно католическая. Мы встречаем самые дикие выдумки относящиеся к рэлигиозной дзеятельности в Западной Украине и Западной Белоруссии. Мы должны показать всю недобросовестность, всю гнустность выдумок этих реакционеров и мракобесов".

У 1939 годзе змяніўся курс дзяржаўнай палітыкі, можна нават гаварыць пра адзіны перыяд у гісторыі СССР, якому характэрна вымушанае дапушчэнне рэлігійнай актывізацыі царкоўнай дзейнасці. Патрыярхія атрымала магчымасць здзяйсняць архірэйскія хіратоніі і прызначаць на пасады ў пустуючых кафедрах, але без сур'ёзных уступак замацаваных заканадаўствам. І нягледзячы на тое, што ў 1939 годзе паказаўся курс звязаны з адмовай ад масіраванага наступлення на рэлігію, усё ж такі прыярытэтнай задачай у рэлігійнай палітыцы дзяржавы асталася пабудова безрэлігійнага грамадства. Але як актывізавалася рэлігійнае жыццё ў краіне з сярэдзіны 1940 года савецкія ўлады зноў узмацняюць сваю антыцаркоўную палітыку ў заходніх абласцях і маюцца факты арыштаў духавенства, хаця гэты працэс у заходніх абласцях Беларусі не атрымаў такога маштабу як на ўсходзе. Былі забойствы святароў, але ў моманты нестабільнасці ў дзяржаве, у моманты дзяржаўнага вакуума гэта можа здарацца. Былі і дэпартацыі духавенства цэлымі сем'ямі.

Апрацаваў Аляксандр ВЯРБІЦКІ

Новае выданне

Трэцяя кніга „Беларуса”

У Нью-Йорку выйшаў з друку літаратурны альманах беларускіх пісьменнікаў замежжа „Беларус-2009”. Выдаўцом альманаха з’яўляецца газета „Беларус”, а рэдактарам — Марат Клакоцкі.

Нагадаю, што дэбют альманаха „Беларус” адбыўся ў 2007 годзе. Потым быў другі альманах — „Беларус-2008”. І сёлета — трэці. Па-рознаму гэтыя выданні былі сустрэты і ацэнены чытачамі, але, калі з беларускімі выданнямі на эміграцыі з кожным годам становіцца цяжэй і цяжэй, выданні закрываюцца і сотні беларускіх газет і часопісаў у Германіі, Францыі, Канадзе, Аўстраліі, Бельгіі, ЗША ўжо не выдаюцца, падобнае выданне трэба вітаць. Такі альманах павінен быць і выдавацца, аб’ядноўваючы вакол сябе новых эмігрантаў-беларусаў, якія маюць здольнасці да „краснага пісьменства”. Ды і па памерах „Беларус-2009” значна пераўзыходзіць папярэднія. Ён налічвае 280 старонак, так як папярэднія складаліся з 205 і 188 старонак. Найперш аб’ём выдання павялічваецца за кошт новых аўтараў і, вядома ж, твораў.

„Беларус-2009” адкрываецца вершамі Георгія Аскеркі. Гэта радкі-прызнанне Беларусі. Аўтар задае сабе пытанне: за што я люблю Беларусь і сам шчыра адказвае: „Люблю, бо яна ў сэрцы”.

У маладога аўтара ёсць і шчымлівыя радкі пра каханне. Ён успамінае пра сваю каханую, якая засталася ў Беларусі, а ён два гады жыве на чужыне і згадвае яе штодня. Але аўтар жыве надзеяй, што яна па-ранейшаму яго кахае і што яны абавязкова сустрэнуцца.

Настальгія і ўспаміны пра каханых людзей, родных і сяброў скразной лініяй праходзяць амаль праз усе паэтычныя творы аўтараў „Беларуса-2009”. Лявон Баравы ў адчаі піша: „Не чакай, не чакай ты мяне, я назад да цябе не вярнуся”. Зміцер Давыдзенка прызнаецца: „Да вачэй глыбокіх і вішнёвых вуснаў я з краёў далёкіх да цябе імкнуся”. Юры Жвалікоўскі свае радкі прысвяціў Віялеце Кавалёвай, пры сустрэчы якой „будзе доўга рукі цалаваць”. А Людміла Карайчэнцава ўспамінае Браслаў, Відзы і дождж, а таксама тое імгненне, калі „гарыць свяча, сядзіць адна і піша ліст каханаму” і г.д. Тая ж Віялета Кавалёва надрукавала арыгінальную падборку вершаў і песень на матывы савецкіх песень мінулых дзесяцігоддзяў. Гэта і дзіцячыя песні, і песні з папулярных савецкіх кінафільмаў і мультфільмаў і г.д. Але іх паэтка пераказала па-свойму, у якіх выказала любоў да Беларусі, да свайго народа. І атрымалася ў яе даволі вобразна, шматфарбна, разнастайна.

Упершыню ў „Беларусе” надрукавалі свае творы Барыс Данілюк з ЗША і Алег Мінкін з Літвы. Трэці раз са сваімі творамі выступае на старонках альманаха Макс Шчур. На гэты раз ён здзівіў чытачоў не толькі сваімі філасофскімі вершамі, але і празаічным творам з такім вось доўгім загалоўкам: „Сямнаццаць імгненняў музы, альбо Бататуйская літаратура XX стагоддзя ў эміграцыі ад А да Я”. І напісаў ён сваю рэч, як прызнаецца сам аўтар, пад уплывам першай кнігі чылійца Раберта Боланьё „Нацы-літаратура ў Амерыцы”, у якой усе імёны прыдуманыя і не маюць адпаведнікаў між рэальных творцаў, таму загадзя аўтар папярэдзіў калег ад спроб кагосьці пазнаць. І, скажу шчыра, „імгненні” ў Макса Шчура атрымаліся смелыя, хаця разумею, што смелыя шуканні, вядома, ніколі не могуць абысціся без пэўнага элемента эксперыментальнасці — той долі рызыкі, наватарскага новаўвядзення, якія трэба творча праверыць, вынесці на суд грамадскасці, замацаваць у эстэтычнай свядомасці чытачоў. Але творчы эксперымент Макса Шчура, а таксама празаіка Віталя Воранава, паэта Сержука Сокалава-Воюша, аднак, нельга ўяўляць як апрабацыю нечага звышскладанага, перспектыўнасць якога — пад вялікім пытальнікам. Іх творы зразумелыя, цікавыя ва ўсіх мастацкіх адносінах, філасафічна ўзмужнелыя і чытэльныя.

З годнымі творамі ў альманаху выступаюць бацька і сын Мурзёнкі: адзін з іх паэмай „Лыжнік”, другі — з успамінамі пра канец 1930-х гадоў на Віцебшчыне.

Апошні раздзел штогодніка называецца „Народная сатыра і гумар”. У мінулых выпусках „Беларуса” сатыра і гумар адсутнічалі. Цяпер на яго старонках з’явіліся быліцы вершам „Найноўшыя дзеі беларусаў у Нью-Йорку” Вядзьмака Брайтан-Бруклінскага. Да гэтых быліцаў Сяржук Сокалаў-Воюш напісаў уступ, у якім ён кажа, што «паэма „Найноўшыя дзеі беларусаў у Нью-Йорку” паводле стылю больш нагадвае не столькі славутыя „Тарас на Парнасе”, „Энеіду навыварат” ці „Лысую гару”, колькі гутаркі — ананімныя рукапісныя творы пачатку XIX стагоддзя, у якіх аўтары вялі размову з народам пра надзённыя праблемы...». Цяжка з гэтым пагадзіцца, бо асноўны грамадзянскі пафас твораў беларускай ананімнай літаратуры пазамінулага стагоддзя быў сялянска-дэмакратычны. Стыхійна-сялянскай дэмакратычнай ідэйнай накіраванасцю найперш тады вылучалася большасць беларускіх ананімных народных гутарак XIX стагоддзя, а пазней і творы выхадцаў з сялянскага асяроддзя. Параўнаць „Найноўшыя дзеі беларусаў у Нью-Йорку” з тымі творамі проста немагчыма. „Найноўшыя дзеі...” — гэта кволенькі экспромт, дзе згадваюцца ў рыфму прозвішчы беларускіх палітыкаў і літаратараў, накшталт такіх:

Ходзяць чуткі на Брайтане й навокала:

У Амерыку перабраўся Воюш-Сокалаў...

Новы альманах, як і мінулыя, багаты на пераклады. Ірына Варабей і Віктар Кавалеўскі пераклалі на родную мову творы Паўліны Джонсан, Томаса Кінга і іншых замежных аўтараў.

З празаічных твораў найбольш хочацца адзначыць таксама ўдалыя апавяданні Валянціны Якімовіч, Аляксандра Тарановіча, Віталя Зайкі, Станіслава Бабкевіча.

Сяргей ЧЫГРЫН

Трагічная гісторыя пакут — так можна характарызаваць часы сталінскіх рэпрэсій у жыцці беларускага народа. Шмат каму з нашчадкаў тых сталінскіх катаў, пэўна, хацелася б, каб гэтыя змрочныя гады сцерліся з памяці людзей. На шчасце, ёсць у Беларусі тыя, хто разумее, што забыццё пра ахвяр сталінізму — гэта прамая дарога да паўтарэння дзяржаўнага злачынства.

Сайт „Пакаянне”, што месціцца ў інтэрнэце па адрасе **http://represii-by.info**, адна са спроб захавання ў народнай памяці тых жудасных падзей. Нават назва гаворыць аб тым, што захаваць тую памяць можна толькі з непераходзячым болем усведамлення немагчымасці інакш дапамагчы ахвярам, як толькі нагадваць, як нагадваюць, напрыклад, крыжы ў Курапатах ці званы ў Хатыні.

Сайт, як сведчыць інфармацыя пададзеная на галоўнай старонцы, з’яўляецца праектам партыі Беларуская хрысціянская дэмакратыя. Выгляд сайта не змяшчае нейкіх квяцістых аздабленняў, гэта і зразумела — не пра радасныя падзеі там ходзіць. Але шэра-карычневы тон старонак стварае зусім змрочны настрой. Адзіная гэтая акалічнасць не спрыяе доўгаму знаходжанню на сайце, нягледзячы на тое, што там пададзена вельмі важная і карысная інфармацыя. З таго хочацца параіць уладальнікам партала зрабіць яго больш прывабным, нягледзячы на тое, што тэма, якую яны ўздымаюць, вельмі сур’ёзная і цяжкая.

Першая старонка сайта прысвечана навінным паведамленням, што тычацца падзей, якія можна арэсліць як сутыкненне светапоглядаў. Тут і суд за „фарбаванне” помніка Леніну, і пытанні перайменавання вуліц, што носяць камуністычныя назвы, новыя факты Катынскай трагедыі. Да таго ж даная старонка падзяляецца на пяць падрубрык — „Курапаты”, „Грамадства”, „Палітыка”, „Рэлігія” і „Культура”.

Рубрыка „Артыкулы” змяшчае тэксты, дзе аналізуецца сітуацыя са стаўленнем да разнастайных падзей у грамадскім жыцці не толькі Беларусі, але і іншых краін.

Сапраўднай скарбонкай сайта з’яўляецца рубрыка „Бібліятэка”. Там сабраныя ўспаміны, даследаванні па тэме рэпрэсій, а таксама мастацкія творы. У падрубрыцы „Антыкамуністычны супраціў” змешчана брашура, дзе распавядаецца пра злачынствы камуністычнага рэжыму і антыкамуністычны супраціў у Беларусі.

Старонка „Асобы” прысвечана змагарам антысавецкага падполля. Кароценька распавядаецца пра іх лёс, даюцца фотаздымкі-партрэты.

Рубрыка „Мапа расстрэлаў” прэзентуецца аўтарамі сайта наступным чынам: „На гэтай старонцы зьмешчаны мапы расстрэлаў ды іншых камуністычных рэпрэсіяў на Беларусі ў перыяд з 1918 па 1953 гг. Гэтыя мапы зьяўляюцца арыгінальнымі навуковымі распрацоўкамі гісторыка Ігара Кузьняцова. У іх упершыню адлюстраваныя раней невядомыя гістарычныя факты”. На старонцы месцяцца дзве карты — адна з іх тычыцца цэлай Беларусі, а другая — выключна Мінска.

Цікавыя матэрыялы падаюцца на старонцы „Мультымедыя”. Там змешчана разнастайная відэаінфармацыя па тэме сталінскіх рэпрэсій. Таксама ёсць інтэрв’ю былых удзельнікаў антысавецкага падполля, пра якіх хадзіла вышэй.

Аўтары сайта заклікаюць прыняць удзел у праекце, дасылаючы ім інфармацыю па данай тэме.

Уладзімір ЛАПЦЭВІЧ

Перадалімпійскія хваляванні

Да алімпійскіх гульняў у Ванкуверы застаецца зусім няшмат часу і падрыхтоўка да іх прыйшла ў завяршальную стадыю. Беларускіх прыхільнікаў хакея зараз найбольш трывожаць фатальныя траўмы нашых заакіянскіх легіянераў. Ветэран і мацнейшы абаронец зборнай за ўсю гісторыю Руслан Салей ужо не гуляе даўно. У бягучым сезоне НХЛ ён згуляў за свой клуб „Каларада” толькі адзін матч. Браты Андрэй і Сяргей Касціцыны з „Манрэаля” таксама траўмаваны. Пашкоджанне, якое атрымаў у апошні дзень 2009 года старэйшы — Андрэй — выклікала досыць сур’ёзныя наступствы — давялося рабіць аперацыю на калене. У ідэальным варыянце ён зможа аднавіцца толькі ў сярэдзіне лютага, а значыць наўрад ці выступіць на алімпіядзе. Выбыў з шыхту „Таронта” і мацнейшы ў зборнай Беларусі форвард на апошнім першынстве свету Міхаіл Грабоўскі. Аднак, на яго надзея куды большая — трэшчына ў руцэ павінна да гульняў зрасціся. Больш таго, галодны да гульні, у Ванкуверы Грабоўскі можа стацца сапраўдным джокерам каманды.

У беларускіх біятланістаў іншыя праблемы. Траўмы ў гэтым відзе — рэдкасць, а вось пытанні пра дакладнасць стральбы сістэмныя. Ну, а ў лідаркі каманды — Дар’і Домрачавай — праблемы яшчэ і з арыентацыяй у прасторы. На чарговым этапе ў нямецкім Обэрхофе наша прыгажуня мела ўсе шанцы на медаль у мас-старце. Пасля двух этапаў яна ішла наперадзе, але на трэцім зноў стала страляць па... чужой мішэні. Гэта ўжо трэцяя недарэчнасць таленавітай, але нестабільнай біятланісткі за апошні перыяд. У эстафеце нашы дзяўчаты стралялі няблага, але хуткасць ва ўсіх, акрамя Домрачавай, нізкая. У выніку 6-е месца — лепшы вынік сезона, але гэта, падаецца, столь, якую падняць не пад сілу. Мужчыны на асобных дыстанцыях паказалі ў цэлым крыху лепшыя свае вынікі, але ж эстафету правалілі.

Але ёсць у Беларусі яшчэ віды спорту, якія жывуць насуперак коснай і савецкай мадэлі развіцця спорту ў краіне. Сярод летніх — гэта веславанне на байдарках і каноэ, а з зімовых дысцыплін — фрыстайл. У апошнім беларусы заўсёды былі заканадаўцамі моды. Вось і зараз узыходзіць зорка (толькі б не сурочыць!) новага лідара — Антон Кушнір пасля трох этапаў узначаліў агульны залік Кубка свету. На апошнім спаборы, які прайшоў у канадскім Калгары, Кушнір узяў серабро. Яго пачын падтрымаў дасведчаны Аляксей Грышын, які толькі выйшаў на афіцыйныя спаборніцтвы і адразу дасягнуў бронзы. Чацвёртым стаў яшчэ адзін беларус — Цімох Слівец (у агульным заліку ён на трэцяй пазіцыі). Набірае абароты ў прамым і пераносным сэнсе і тытулаваны Дзмітрый Дашчынскі. Кожны з іх у Ванкуверы здольны на медаль. Пазбегнуць бы толькі траўмаў. Дагэтуль у памяці трагедыя, якая здарылася з таленавітым Дзмітрыем Ракам, які пасля траўмы галавы ледзь застаўся жывым. Вось і ў Калгары сур’ёзная траўма здарылася з дасведчанай Алай Цупер — яе ўдзел у алімпіядзе цяпер пад вялікім пытаннем. Галоўная надзея цяпер на Асоль Слівец, якая пасля перапынку, звязанага з замуствам, вярнулася на трамплін.

Беларускія лыжнікі і канькабежцы так выступаюць на міжнародных спаборніцтвах, што хваляваццa за іх не даводзіцца. У тым сэнсе, што на алімпіядзе на нішто сур’ёзнае, нават на заваёву заліковых ачкоў, не разлічваюць. Хіба толькі ветэран лыжных гонак Сяргей Далідовіч, які пакуль рыхтуецца па індывідуальнай праграме, можа трапіць у дзесятку на якой адной дыстанцыі. Такі вось перадалімпійскі расклад.

Уладзімір ХІЛЬМАНОВІЧ

Аб з'ездаўскіх прапановах

На XVI З'ездзе Беларускага грамадска-культурнага таварыства, які адбыўся 20 снежня 2009 г. у Беластоку, голас бралі як дэлегаты, так і запрошаныя госці. У сваіх выступленнях закраналі яны важныя для нашай беларускай меншасці ў Польшчы справы. На маю думку, цяпер нам, беларусам Беласточчыны, патрэбныя як ніколі братэрская падтрымка і ўзаемавыручка. Калі паміж намі будзе еднасць, то тады ў чалавечых душах крызісу не будзе. Гэта вельмі важна для нас, усіх дзеячаў беларусіх арганізацый, якія апынуліся па абодвух баках барыкады.

У сваім выступленні айцец Рыгор Місіюк вельмі выразна паказаў адкуль пагражае небяспека нашай нацыі і яе культуры ды праваслаўю. На канец а. Рыгор запрапанаваў, каб чарговыя важныя сустрэчы беларусаў пачыналіся з малітвы. Гэтую прапанову ўсе сабраныя адобрылі бурнымі апладысментамі.

На адрас з'езда прыйшлі пісьмовыя прапановы ад дзвюх асоб. Анастасія Майсеня прапанавала ўстанавіць у Беларускім музеі ў Гайнаўцы памятную дошку з надпісам, што ў пабудове музея вялікую дапамогу аказалі ўрад Беларускай Дзяржавы, яе грамадзяне і шматлікія прадпрыемствы. Удава па Канстанціне Майсеню, будаўніку музея, папрасіла дэлегатаў з'езда зрабіць старанні па вяртанні на фасад музейнага будынка беларускага арнамента. Таксама музейных спраў датычылі прапановы Георгія Зюзі з Варшавы, ураджэнца Рудні. У сваім лісце напісаў ён, між іншым, што „беларускае асяроддзе ў Варшаве занепакоенае сітуацыяй, у якой апынуўся Музей і асяродак беларускай культуры ў Гайнаўцы. На яго пабудову складаліся беларусы з Польшчы, Беларусі, цэлага свету. (...) Сітуацыя з Музеем (...) ідзе ў такім напрамку, што за 10-20 гадоў не будзе вядома, што гэта беларускі музей і цэнтр і хто яго будаваў". Далей аўтар ліста пералічыў свае прапановы: вярнуць на фасад будынка беларускі арнамент; прысвоіць музею імя яго стваральніка Канстанціна Майсені; змясціць на будынку музея табліцу на польскай і беларускай мовах з інфармацыяй аб ахвяравальніках (беларусы з Польшчы і ўсяго свету, ПНР і яе грамадзяне, БССР і яе грамадзяне, РП і яе грамадзяне, РБ і яе грамадзяне).

Хачу падкрэсліць, што важныя прапановы Анастасіі Майсені і Георгія Зюзі дэлегаты прынялі да рэалізацыі новаабранымі ўладамі БГКТ.

Віктар БУРА

Нараўчанская гміна

Запрашэнне да конкурсу

Таварыства сяброў Нараўчанскай зямлі запрашае да ўдзелу ў конкурсе пад загалоўкам „Нараўчанская зямля — людзі і факты — ва ўспамінах найстарэйшых жыхароў". Гэта можа быць літаратурны твор, інтэрв'ю, рэпартаж (з фотаздымкамі і дакументамі), а таксама кароткія фільмы.

Тэрмін высылкі прац — да 30 мая 2010 года. Прымаюць іх у Гмінным асяродку культуры (ГАК) у Нараўцы. Вынікі — 30 чэрвеня 2010 года.

Па дэталёвую інфармацыю звяртацца можна ў ГАК таксама па тэлефоне 85 6858030, ад 10 да 18 гадзіны, пытацца ў спадарыні дырэктар Анны Стульгіс.

Вулічнае асвятленне толькі да 22 гадзіны

Вулічнае асвятленне ў вёсках Нараўчанскай гміны (Гайнаўскі павет) дзейнічае вечарам толькі да гадзіны 22. Ну, што ж, трэба ўсюды ашчаджаць, дык ашчаджаем. А што аблягчаем занятак зладзеям ды пагаршаем бяспеку на вуліцах, гэта, мабыць, другарадная справа. Бывае ж.

І вось вулічане асвятленне блісне на некалькі гадзін і патухне. А зімняя ноч — доўгая.

Дык тут зусім нядаўна, перад святамі Раждаства Хрыстова, ноччу на тэрыторыі Нараўчанскай гміны матарызаваныя зладзеі абрабавалі дзве прадуктовыя крамы: у Новым Ляўкове і ў Нараўцы. Вось табе на! Ну, але электраэнергіі менш затрачваем. **(яц)**

НАШЫ КАРЭСПАНДЭНТЫ

Усяночная ў Ласінцы

Фота аўтара

Настаяцель Георгій Кос у час багаслужбы

Як хуценька бяжыць час! Ізноў прайшоў год. Набліжаліся Куцця і Каляды. Ва ўсіх дамах і царкве вялася падрыхтоўка да свята, было многа працы. Рабіць парадкі ўзяліся прыхаджане Ласінскага прыхода з яго настаяцелем а. Георгіем Косам. Перад царквой быў наведзены ідэальны парадак, а ў дамах загарэліся рознакаляровыя лямпачкі на ёлачках. Ласінскія прыхаджане — актыўныя людзі!

Перад багаслужбай панаваў прыўзняты настрой. Сталі з'язджацца не толькі мясцовыя прыхаджане, але і вернікі з іншых вёсак і гарадоў. Аднак у царкве, як на такі вялікі прыход, вернікаў сабралася малавата. Відаць, пабаяліся марозу.

Перад пачаткам службы ў храм прыбылі з гвяздай два хары, у якіх спяваюць дзеці і дарослыя. Кіравала імі Марыя Бубка. Праспявалі яны многа цікавых калядак. Прыемна было слухаць такое харошае выступленне. Падзякаваў ім а. Георгій і высока ацаніў дырыжорскае майстэрства Марыі Бубкі.

Потым у дзве гадзіны ночы пачалася багаслужба. На канец настаяцель падзякаваў усім прыбыўшым і харам за такую вялікую актыўнасць. Гэты дзень усім прынёс многа радасці і пазітыўных уражанняў.

Андрэй ЯЛОЗА

Гайнаўка

Што ў 2010 годзе?

Апошнім часам была гарачая дыскусія падчас сесіі Гарадской рады ў Гайнаўцы. Найбольш эмоцый выклікала справа выдаткаў з гарадскога бюджэту на інвестыцыі ў 2010 годзе. Некаторыя радныя мелі свае прапановы, напрыклад, адносна перабудовы вуліц у пасёлках, у якіх пражываюць і ў якіх іх выбіралі дэпутатамі. Яны горача патрабавалі ажыццяўлення ўжо сёлета сваіх прапаноў, але не ўсім гэта ўдалося. Адкуль жа ўзяць грошы на ўсе патрэбы? А вядома, сёлета восенню самаўрадавыя выбары на чарговы тэрмін.

І так, у гэтым годзе будуць пабудаваны новыя маставыя на вуліцах Паркавай, Багнавой, Тапалёвай і Зофіі Налкоўскай. Будзе пабудавана электраўстаноўка асвятлення па вуліцы Філіпчука.

Знайшлі грошы на апрацоўку новага праекта гарадскога парку. Як мне вядома, гэты парк малы, у ім месца займелі амфітэатр ды фантан і дрэў тых няшмат. Яго ж абмяжоўваюць вуліцы м.інш. Паркавая, Белавежская і Арміі Краёвай. Калі няма як павялічыць яго плошчу (а няма) і пасадзіць больш дрэў, якія тут найважнейшыя, тады што тут праектаваць і на праект даваць грошы? Мабыць, праект патрэбны толькі дзеля таго, якія дрэвы ссячы?..

Янка ЦЕЛУШЭЦКІ

Адгаданка

Шыфраграма

Літары адгаданых слоў, перанесеныя згодна з іх парадкавымі нумарамі ў клеткі роспісу, складуць рашэнне — азербайджанскую пагаворку.

1. неабходны ветраку = 10 _ 11 _ 14 _ 9 _ 5 _;
2. без агню яго не бывае = 12 _ 24 _ 20 _;
3. прыхільнік масонства = 7 _ 6 _ 3 _ 4 _ 8 _;
4. вага тавару без тары і ўпакоўкі = 1 _ 2 _ 25 _ 19 _;
5. пузырыстая маса, якая ўтвараецца на паверхні некаторых вадкасцей = 23 _ 22 _ 21 _ 13 _;
6. мястэчка ў Ваўкавыскім раёне = 18 _ 17 _ 16 _ 15 _;
7. паслухмянае дзіця = 27 _ 26 _ 28 _ 29 _.

(ш)



Сярод чытачоў, якія на працягу месяца дашлюць у рэдакцыю правільныя адказы, будуць разыграны кніжныя ўзнагароды.

Адказ на адгаданку з 51 нумара

Сыраежка, палын, Расія, вол, Мухавец, Прыпяць.

Рашэнне: **Арлы не ловяць мух.**

Кніжныя ўзнагароды высылаем **Казіміру Радошку** са Свебадзіцаў і **Лукашу Пацэвічу** з Беластока.

Ніва
ТЫДНЁВІК БЕЛАРУСАЎ У ПОЛЬШЧЫ
PL ISSN 0546-1960
NR INDEKSU 366714

Выдавец: Праграмная рада тыднёвіка „Ніва".
Старшыня: Яўген Вапа.
Адрас рэдакцыі: 15-959 Białystok 2, ul. Zamenhofa 27, skr. poczt. 84.
Тэл./факс: (+48 85) 743 50 22.
Internet: *http://niva.iig.pl/*
E-mail: *redakcja@niva.iig.pl*
Zrealizowano dzięki dotacji Ministra Spraw Wewnętrznych i Administracji.

Галоўны рэдактар: Яўген Вапа.
Намеснік гал. рэдактара: Віталь Луба.
Тэхнічны рэдактар: Адам Паўлоўскі.
Рэдактар „Зоркі": Ганна Кандрацюк-Свярубская.
Публіцысты: Міхась Андрасюк, Мікола Ваўранюк, Аляксандр Вярбіцкі, Ганна Кандрацюк-Свярубская, Ілона Карпюк, Міраслава Лукша, Аляксей Мароз, Мацей Халадоўскі, Віктар Сазонаў, Уладзімір Хільмановіч, Міхась Сцепанюк.
Канцылярыя: Галіна Рамашка.
Друкарня: „Orthdruk", Białystok.
Tekstów nie zamówionych redakcja nie zwraca. Zastrzega sobie również prawo skracania i opracowania redakcyjnego tekstów nie zamówionych. Za treść ogłoszeń redakcja nie ponosi odpowiedzialności.

Prenumerata krajowa
Termin przyjmowania wpłat do 5-go dnia każdego miesiąca poprzedzającego okres rozpoczęcia prenumeraty. Wpłaty przyjmują urzędy pocztowe na terenie województwa podlaskiego oraz oddziały „RUCH" i „KOLPORTER" na terenie całego kraju. Cena prenumeraty kwartalnej — 32,5 zł., półrocznej — 65 zł., rocznej — 130,5 zł.

Prenumerata z wysyłką za granicę
Wpłaty przyjmuje „RUCH" S.A. Oddział Krajowej Dystrybucji Prasy, ul. Jana Kazimierza 31/33, 01-248 Warszawa; telefony: +48(0)22 53-28-823 — prenumerata płatna w walucie obcej, 0-2253-28-816, 53-28-819; — prenumerata płatna w PLN; nr faxu: 0-2253-28-734

Prenumerata w redakcji
Planowana ilość numerów „Niwy" w 2010 roku — 52.

Poczta zwykła: Cena 1 egz. wraz z wysyłką w kraju wynosi 4,2 zł. Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę — kraje europejskie — 6,50 zł. — kraje pozaeuropejskie — 5,70 zł.

Poczta lotnicza: Cena 1 egz. wraz z wysyłką za granicę: — kraje europejskie — 6,50 zł, — Ameryka Północna, Afryka — 6,90 zł., — Ameryka Południowa — 8,30 zł., — Australia i Oceania — 10,50 zł.
Wpłaty przyjmuje:
Rada Programowa Tygodnika „Niwa",
BANK PEKAO S.A. O/Białystok
38 1240 5211 1111 0000 4929 0945

Nakład: 1 250 egz.

Дзядоўскае турнэ з Анатолем С. (9)

Ганна КАНДРАЦЮК

Анатоль Сыс у сваёй экзальтаванасці не меў сабе роўных, асабліва, калі гутарка ішла пра першынство ў паэзіі. Паэт з Гарошкава, як вядома, сам сябе лічыў духовым сынам Янкі Купалы і братам Максіма Багдановіча. У рэальным свеце ён таксама не хацеў бачыць абы-якой кампаніі. Па сёння ў Мінску паўтараюць яго бесцырымонны тэкст пра ўзровень сучаснай паэзіі. Замест кідацца ў модны і выгодны рэлятывізм, ад якога смярдзіць на салонах, Анатоль, як праўдзівы мужык з Гарошкава, даў канкурэнцыі жару:

— Пакажыце роўнага мне паэта, то сам яму ногі памыю. А калі пакажаце лепшага за мяне, то не толькі яму ногі памыю, яшчэ і ваду тую вып'ю!

Біблейскі выклік, нягледзячы на высокі адсотак прэтэндэнтаў на першынство ў беларускай паэзіі, так і астаўся без адгалоскі. У сапраўднасці Анатоль, пра што ведалі яго фанаты і нават варажэнькі, не быў з хваравітых зайздроснікаў. Ён, як ніхто з яму сучасных, намаўляў і заклікаў пісаць па-беларуску знеахвочаных калег па пяру. Пісаць вершы ён прапанаваў чыстым аматарам, нават калі тыя ні ў зуб не ведалі беларускай мовы або займаліся літаратурнай крытыкай. І асабліва штурхаў маладых:

— Я бачу ў табе паэтычныя здольнасці, — паўтараў ён ашаломленым прапановай навічкам і пачаткоўцам, — *ты будзеш пісаць па-беларуску, не здавайся і не бойся, пішы.*

Можна сказаць, што сам множыў сабе канкурэнцыю і вітаў яе са спадзяваннем. Бо як сапраўдны рамантык, ён верыў у адраджэнне беларускага духу з дапамогай паэта-прарока. Ён павіннен з'явіцца пасля яго смерці, у лепшы для літаратуры час. За гэта Анатоль Сыс, у што не сумняваецца ад пачатку да канца чытач, гатовы не толькі памыць ногі, але і пайсці ў агонь.

* * *

Мы пайшлі проста ў *рай*. Калі разам з Мірай і Валяй мы перасяклі браму *раю*, як гаварыў пра свае вясковыя могілкі Анатоль Сыс, я не верыла, што выпадзе мне гонар прыбіраць магілку любімага паэта. Ды і не хацелася гэтага, бо сама прырода ўжо навяла тут парадкі. Уся плошча *кладзьбішча* напамінала залаты луг з блакітнымі крыжамі. Тыя белыя і светлыя бярозы, якія так часта сустракаем між паэтычных радкоў Анатоля, якраз атрэслі сваё жоўтае лісце. Здавалася, ад іх пацяплела зямелька. Блакітныя крыжы, усе павязаныя белымі ручнічкамі-стужкамі, падобныя на сябе як сваякі-аднапляменцы, здаваліся непрыкметнымі ў цэласці. Толькі помнік паэта рэзка вылучаўся сярод жалезна-блакітнага лесу. У пачатковай задуме помнік меў напамінаць каменную стэлу. Пасля мастак Генадзь Лойка вычасаў у камені галаву Анатоля, даў стэле форму крыжа і прыаздобіў яе цярністым гняздзечкам з салаўём. Хочаш ці не, думаеш пра музыку, менавіта пра цішыню і спакой месца, якое як пісаў паэт: *здзіўляе спакоем душу*. У такіх месцах не сорам заплакаць. Пасля я прайшлася між магіл, каб спыніцца на канцы ўзгорка, на якім *кладзьбішча*. Унізе, сярод шырокай на дзесяць кіламетраў даліны, віднеў Дняпро.

* * *

У вершы „Рай", якому без сумненняў назначу першынство сярод дзядоўскіх твораў у беларускай літаратуры, скрыжаваліся радасць і смутак беларускага лёсу, праўда пра магчымыя і немагчымая далягляды нашых памкненняў і тая лагічная перспектыва шчасця, якая вядзе проста ў рай, значыць у магілу. „Рай" Анатоля са мной, калі перасякаю браму любой некраполіі свету. Таму на месцы, якое можна лічыць жывым літаратурным полем, мы былі гатовы ўспрыняць кожны, нават мала істотны, выпадак ці здарэнне як алегорыю. Як з'яўленне сабакі, які прыпёрся дзесьці з палёў і пасля знік быццам выйшаў са спарахнелых душ...

Самыя вясёлыя і галасістыя салаўі — на вясковых могілках. Напэўна таму, што днююць і начуюць не ў гнёздах, а ў душах маіх спарахнелых дзядоў. Яны ж, сведчыць тутэйшы народ, былі самымі жыццярадаснымі і жартаўлівымі людзьмі на Палессі.

І бярозы тут самыя белыя... Такія белыя, што ўначы здаюцца прывідамі. Дзяды і нават божышчы маіх дзядоў, як тварамі, так і думамі, былі такімі ж светлымі.

І толькі жвір на могілках калючы і цяжкі, калі прыходзіцца кідаць свае тры жмені наўслед нябожчыку, як самыя важныя словы, якія не паспеў сказаць яму яшчэ ўчора.

Жыве старэнькая бабулька каля самых могілак, яна іх называе не інакш як раем і ўсё часцей і часцей думае пра яго... „Чаму"? — неяк запытаўся я ў яе. „Таму што ў пекле ўжо нажылася" (А. С. — Рай).

* * *

Той сабака, маладая аўчарка, яна пазней паказалася нам яшчэ ў Жыровічах і ў Зэльве. Да гэтай пары мы не звярталі ўвагі на ўсякага роду і масці псярню і іншыя жывінкі. Дух Анатоля аб'явіўся яшчэ і ў надта экзальтаваны манер і напалохаў нас.

— Ён, відаць, моцна пакрыўдзіўся на нас, — сказала паўшэпатам Валя. Мы з Мірай падтакнулі. Самі ж бачылі той кілішак велічынёю ў шклянку, які сямейка паставіла на магіле паэта. Калі мы ўжо збіраліся адыходзіць і ў думках гаварылі развітальныя словы, пацір сам па сабе перавярнуўся. Пасудзіна грымнулася аб каменную пліту, здавалася, разаб'ецца. Калі яе паставілі на ножку, чара яшчэ раз перавярнулася...

Каб не валакіта па сельсаветах і міліцыі за прапіскай, мы яшчэ ў той самы дзень злёталі б на могілкі з патрэбнымі прыпасамі.

Рытуальны недахоп выправіць паэт Эдуард Акулін. На другі дзень, калі ля магілы паэта збярэцца цвет беларускай літаратуры (і не толькі), Эдуард дастане з-за пазухі пляшку „Крамбамбулі" і напоўніць ёю ўгнеўлены келіх. Народ, у тым ліку і міліцыя, адобраць ягоны ўчынак усмешкай зразумення.

(*працяг будзе*)

Фота Ганны КАНДРАЦЮК

Надпіс на помніку: „Як па зорах, па расе твой апошні шлях праляжа, памірай, а жыта сей. Рунь пра сейбіта раскажа", А.Сыс

Фота Міры ЛУКШЫ

24.01 — 30.01

(22.03. — 20.04.) Не падвядзе цябе інстынкт. Будзеш паспяхова дзейнічаць. Можаш спраўна зрэалізаваць дальнабачны план. Можаш адчуць сябе як на полі бітвы. Змагаючыся за сваё, можаш страціць шмат энергіі і стаміцца. Непаразуменні ў сям'і — у поўню Месяца (30.01.)

(21.04. — 21.05.) Сваёй лаяльнасцю, сумленнасцю і мілымі паводзінамі пераканаеш перш за ўсё кіраўніцтва. Будзеш спрытны і разважны. Не дасць табе спакою былое няздзейсненае каханне. Можа табе перашкодзіць у кар'еры зайздросная сяброўка. Здалёку абмінай раўнівых і фальшывых людзей!

(22.05. — 22.06.) Твае прафесійныя поспехі будуць падмацаваны ўзнагародай. Атрымаеш усё, чаго папросіш. Калі хтосьці цябе блага ацэніць, не абражайся. Пазбягай усяго, што нясе хаос і эмацыянальную завіруху. У фірме ты неабходны, але для некаторых гэта нявыгадна (магчымыя канфлікты).

(23.06. — 23.07.) 25-29.01. — зоркі гарантуюць табе знакамітую матэрыяльную сітуацыю, магчымасць добрага заробку. 29-31.01. — добры час выказаць свае пачуцці і наладзіць супольныя планы. Але 30.01. распуста ў выдаванні грошай можа давесці цябе да бяды!

(24.07. — 23.08.) Можаш падпісваць важныя дамовы. За тваю працавітасць і адданне пахваліць цябе кіраўніцтва. 24-26.01. могуць перабудавацца твае адносіны з людзьмі. 27-31.01. можаш страціць энергію на бесталковыя сваркі і дзеянні, якія не прынясуць ніякага выніку. Змаганне з самім сабой пакажа, колькі ў табе самім супярэчлівасцей.

(24.08. — 3.09.) Да працы пачнеш прыкладвацца больш, бо ўбачыш, што памалу пачынае ў гэтым плане пакідаць цябе шчасце. І нанова трэба будзе запрацаваць на поспех. Дасі рады! Зробіш яшчэ штосьці шалёнае, сабе і партнёру на радасць.

(24.09. — 23.10.) Падзарадзіш сабе акумулятары. У пары выбухне пажар пачуццяў. Але песімізм і безупыннае нараканне могуць усё патушыць і стаць прычынай непаразуменняў.

(24.10. — 22.11.) 25-29.01. будзеш гатовы да адрачэнняў, і пункт па пункце зрэалізуеш свае намеры. Дзякуючы крэатыўнасці знойдзеш выхад нават з безнадзейных сітуацый. Хоць не ўсё пойдзе згодна з тваімі планамі. Дарэчы, цяжкі час у апошнія дні студзеня. Прадбачваюцца змены, да якіх ты не гатовы. Нялёгкія выбары! А варта і пагаладаць!

(23.11. — 22.12.) Не пераацэньвай сваіх сіл, каб не трапіць у небяспеку. Не вельмі добры час на падарожжы, таксама фатальны момант на кантакты з юрыстамі і адвакатамі. Некарысныя таксама экстрэмальныя прыёмы ў вырашанні спраў.

(23.12. — 20.01.) Да 26.01. хутка рассакрэціш намеры іншых. Але стрымайся з рэалізацыяй важных планаў. Мачымыя клопаты ва установах і судах.

(21.01. — 19.02.) Хоць не маеш галавы да інтарэсаў, у кашалёк можа заляцець нямала граша. 24-27.01. не падпісвай дакументаў і не наладжвай ніякіх дамоў. 27-31.01. магчымыя страты ў інтарэсах (хтосьці можа адкінуць тваю прапанову з-за абы-якіх прычын).

(20.02. — 21.03.) Маеш смеласць да адважных прыёмаў. 25-29.01. маеш найбольшую пераканаўчую сілу. Цяпер ты рушыў з месца ў кар'еры, развінешся, выкарыстаеш свае таленты, пачнеш здзяйсняць свае найбольшыя мары.

Агата АРЛЯНСКАЯ

ISSN 0546-1960